Н. А. Шаўчэнка, В. Х. Серадзінская

# ЧАЛАВЕК І СВЕТ

4 КЛАС




частка 2

**Н. А. Шаўчэнка, В. Х. Серадзінская**

# ЧАЛАВЕК І СВЕТ

Вучэбны дапаможнік для 4 класа
першага аддзялення дапаможнай школы
з беларускай мовай навучання

У 2 частках

Частка 2

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь*

2-е выданне, перапрацаванае

Мінск
«Адукацыя і выхаванне»
2016

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

УДК 502(075.2=161.3)-056.313
ББК 74.3
Ш29

Пераклад з рускай мовы *М. М. Шавыркінай*

Р э ц э н з е н т ы: кафедра прыродазнаўчанавуковых дысцыплін факультэта пачатковай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» (кандыдат педагагічных навук, дацэнт *Л. І. Баранава*); настаўнік пачатковых класаў першай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Бабруйская дапаможная школа» *А. У. Мурашка*

**Шаўчэнка, Н. А.**
Ш29 Чалавек і свет : вучэб. дапам. для 4-га кл. 1-га аддз-ня дапам. шк. з беларус. мовай навучання. У 2 ч. Ч. 2 / Н. А. Шаўчэнка, В. Х. Серадзінская ; пер. з рус. мовы М. М. Шавыркінай. — 2-е выд., перапрац. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2016. — 144 с. : іл.

ISBN 978-985-471-890-3.

**УДК 502(075.2=161.3)-056.313**
**ББК 74.3**

**ISBN 978-985-471-890-3 (ч. 2)**
**ISBN 978-985-471-891-0**

© Шаўчэнка Н. А., Серадзінская В. Х., 2011
© Шаўчэнка Н. А., Серадзінская В. Х., 2016, са змяненнямі
© Шавыркіна М. М., пераклад на беларускую мову, 2016
© Афармленне. РУП «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”», 2016

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Умоўныя абазначэнні



Пытанні і заданні перад чытаннем тэксту



Гэта важна ведаць і ўмець



Пытанні і заданні для паўтарэння і замацавання



Новыя словы і словазлучэнні



Работа ў парах, групах (праводзіцца пад кіраўніцтвам настаўніка)



Пытанні і заданні для пазаўрочнай работы (настаўнік кіруе праз выхавальнікаў, бацькоў)



Гэта цікава (вывучаецца на выбар настаўніка)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ЧАЛАВЕК І ЯГО ЗДАРОЎЕ

## ЗДАРОЎЕ ЧАЛАВЕКА — ЯГО ГАЛОЎНАЕ БАГАЦЦЕ

### 1. Чалавеку важна быць здаровым

Успомніце, як вы сябе адчувалі, калі хварэлі. Як вы выглядалі тады? Ці прыемны людзям чалавек, які кашляе і чыхае?

Як і ўсе жывыя арганізмы, чалавек дыхае, харчуецца, ***расце*** і ***развіваецца***, памірае. У чалавека нараджаюцца дзеці. Як і іншым жывым арганізмам, яму для жыцця неабходны паветра, вада, ежа, цяпло, святло. Чалавек — частка жывой прыроды. Але ён займае асаблівае месца ў прыродзе. Ад іншых жывых арганізмаў чалавек адрозніваецца сваім развіццём, паводзінамі. Ён думае, размаўляе, працуе.

Кожны чалавек хоча быць здаровым. Быць здаровым вельмі важна. Здаровы чалавек добра сябе адчувае, правільна развіваецца. Ён вясёлы, **актыўны, жыццярадасны**. У яго добры настрой. Ён добра вучыцца і паспяхова працуе, спраўляецца з любой работай.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Хворы чалавек адчувае сябе дрэнна. Ён выглядае бледным, робіцца **пасіўным**, капрызлівым, плаксівым. Яму не хочацца рухацца, есці. У яго можа павышацца тэмпература цела. Прычынамі хвароб могуць быць прастуда, няправільнае харчаванне, **інфекцыя**, шкодныя звычкі, парушэнне рэжыму дня. Каб высветліць прычыну хваробы, неабходна звярнуцца да доктара.

Пра ваша здароўе клапоцяцца бацькі, настаўнікі, выхавальнікі. Але найлепш паклапаціцца пра яго можаце вы самі. Каб быць здаровым, трэба ведаць і выконваць ***правілы захавання і ўмацавання здароўя***. Некаторыя школьнікі іх ведаюць, але амаль ніколі не выконваюць. То лянуюцца, то забываюцца, то спяшаюцца і кажуць сабе: пачну з заўтрашняга дня. На наступны дзень і праз дзень паўтараецца тое самае. Ці будуць яны здаровыя?





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Памятайце!** Правілы захавання і ўмацавання здароўя прыносяць карысць таму, хто выконвае іх пастаянна, а не ад выпадку да выпадку. На ваша здароўе многае ўплывае. Напрыклад, ці сочыце вы за сваёй пастаwай? Ці мыеце рукі перад ядой? Ці бываеце на свежым паветры? Ці правільна харчуецеся? Ці робіце раніцай зарадку? Ці загартоўваеце вы свой арганізм?

Для здароўя шкодна піць халодную ваду: можна прастудзіцца. Падчас яды не варта спяшацца, размаўляць. Кавалачкі ежы могуць патрапіць у **дыхальнае горла**. Трэба сачыць за чысцінёй сваёй скуры, валасоў, пазногцяў.

1. Хто клапоціцца пра ваша здароўе? Хто можа зрабіць гэта лепш за іншых?

2. Раскажыце, як вы самі клапоціцеся пра сваё здароўе. Карыстайцеся малюнкам на с. 5.

3. Назавіце правілы захавання і ўмацавання здароўя.

4. Пры якой умове правілы захавання і ўмацавання здароўя прыносяць карысць?

5. Ці заўсёды вы выконваеце гэтыя правілы?

**Акты́ўны, жыццяра́дасны, пасі́ўны, інфе́кцыя, ды́хальнае го́рла.**

Раскажыце, што робіць кожны з вас, каб быць здаровым? Ад чаго вам трэба адмовіцца, каб



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

умацаваць сваё здароўе? Пакажыце, якія фізічныя практыкаванні вы робіце падчас ранішняй зарадкі.

Патрэніруйцеся правільна мыць і выціраць рукі, ногі, чысціць зубы. Разам з дарослымі развучыце некалькі практыкаванняў для ранішняй зарадкі.

## 2. Значэнне рэжыму дня, заняткаў фізкультурай

Раскажыце пра свой расклад дня. Што вы робіце раніцай (удзень, увечары)? Ці бываеце на свежым паветры? Чым займаецеся на свежым паветры? Якую **спартыўную секцыю** наведваеце?

Вы ўжо ведаеце, што моцнае здароўе патрэбна кожнаму чалавеку. Умацаванню здароўя дапамагае **рэжым** (расклад) дня. Калі чалавек кладзецца спаць і ўстае штодзень у пэўныя гадзіны, то ён хутка засынае. А раніцай пасля моцнага сну ён лёгка прачынаецца. Устае бадзёрым, з добрым настроем. Школьнікі, якія штодзень займаюцца і адпачываюць у адзін і той час, менш стамляюцца, добра вучацца. Яны паспяваюць за дзень многае зрабіць, цікава адпачыць.

Вучоба ў школе, выкананне дамашніх заданняў — сур'ёзная праца. Бывае, што школьнікі заняты



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

не менш за дарослых. Каб пры гэтым захаваць здароўе, трэба абавязкова выконваць рэжым дня, займацца фізкультурай.



Выконваць рэжым дня — гэта значыць ***своечасова*** класціся спаць. Раніцай уставаць у адзін і той час. Без напаміну раніцай рабіць зарадку. Удзень ***чаргаваць*** працу з адпачынкам. **Памятайце!** У рэжым дня трэба ўключаць хатнюю працу, прагулкі, рухавыя гульні, працу на свежым паветры. Неабходна больш рухацца. Працяглы адпачынак ля тэлевізара, камп'ютара шкодны для зроку і для здароўя ўсяго арганізма.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Якое значэнне для здароўя мае рэжым дня?

2. Раскажыце пра свой рэжым дня. Ці заўсёды вы яго выконваеце?

3. Што значыць шмат рухацца?

4. Раскажыце, як вы адпачываеце пасля ўрокаў.

**Спарты́ўная се́кцыя, рэжы́м.**

Абмяркуйце свой рэжым дня. Пры неабходнасці зрабіце на аркушы шчыльнай паперы табліцу. Запішыце свой рэжым дня. Палічыце, колькі часу вы адводзіце на хатнія справы, дапамогу бацькам. Колькі часу вы гуляеце? Якія віды адпачынку ёсць у вашым рэжыме?

| Час | Што рабіць |
| --- | --- |
| | |

Хлопчыку часта не хапала часу, каб дапамагчы маме па доме. Ён заўсёды казаў: «Я не паспеў. Часу не хапіла».

Аднойчы вечарам мама прапанавала сыну ўспомніць, што ён рабіў пасля ўрокаў.

— Я паволі ішоў са школы. Па дарозе гуляў з сябрамі, назіраў за птушкамі. Потым сядзеў на лаўцы. А схадзіць па хлеб я не паспеў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

— Усё зразумела. Будзем вучыццца будаваць твой дзень. Пачнём з таго, што напішам расклад дня.

# ПРАФІЛАКТЫКА ХВАРОБ

## 3. Прафілактыка няшчасных выпадкаў дома, у школе

Ці былі ў вас траўмы? Як гэта здарылася? Ці можна было пазбегнуць **небяспекі**? Як?

Вакол нас мноства розных прадметаў. Пры няправільных паводзінах дома, у школе яны могуць быць небяспечнымі. Асабліва часта патрапляюць у бяду дзеці. Небяспека не страшная тым, хто ведае пра яе і ўмее яе пазбягаць.

Усім вядома, што пры няправільным карыстанні агнём можа ўзнікнуць ***пажар***. Тушыць пажар нялёгка. Ад агню здараецца многа гора. У агні згараюць не толькі будынкі, рэчы, але і людзі. **Папярэдзіць** пажар можна. Ніколі і нідзе не гуляйце з запалкамі. Без дарослых не разводзьце вогнішчы на прыродзе. Самастойна не ўключайце газавую пліту, а ў вясковым доме не спрабуйце распаліць печ. Не ўключайце і не пакідайце без дагляду ўключаныя прасы і іншыя **электрапрыборы**.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У хаце, кватэры захоўваюцца розныя ***мыйныя*** сродкі. Гэта небяспечныя для здароўя рэчывы. Імі трэба ўмець карыстацца. Без дазволу дарослых іх нельга чапаць, нюхаць.

Небяспечным месцам у доме з'яўляецца кухня. Там варта быць асцярожным з ***награвальнымі прыборамі***, кіпенем. Апальвае не толькі агонь і гарачая вада, але і пара. Накрыўку з каструлі з кіпенем трэба здымаць асцярожна. Небяспечнымі могуць быць ручкі ад скавародак, каструль. За іх можна зачапіцца і вывернуць посуд, выліць на сябяе кіпень. **Апёк** — гэта заўсёды балюча. Да таго ж апёкі доўга лечацца.

У доме шмат вострых ***колючых*** і ***рэжучых*** прадметаў: нажы, відэльцы, нажніцы, іголкі. У побыце гэта неабходныя рэчы, але карыстацца імі трэба асцярожна. Іх нельга раскідаць, бо на іх можна наступіць і параніцца. У пакоі, нават калі ён вялікі, не варта гуляць у рухавыя гульні. Для такіх заняткаў ёсць двор і спартыўныя пляцоўкі. Не трэба залазіць на высокія прадметы, скакаць з іх. Небяспечнымі месцамі ў хаце, кватэры з'яўляюцца падваконнікі, балконы, адчыненыя вокны. Нельга высоўвацца з акна, сядзець на падваконніку, звешвацца з балкона.

У школе **няшчасныя выпадкі** звычайна здараюцца падчас перапынкаў. Небяспечнымі могуць быць мокрыя пасля мыцця падлога, лесвіцы, мэбля. Дзеці часам падаюць, б'юцца аб востры край прадметаў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Часта яны раняць скуру на локцях і каленях. Любая рана — адчыненыя вароты для інфекцыі.

**Памятайце!** Нават самыя звычайныя рэчы могуць быць небяспечнымі, калі імі неасцярожна або няправільна карыстацца. Напрыклад, у кожным доме ёсць пральная машына. Усярэдзіне круцяцца дэталі. Неабходна ведаць, як і калі ўключыць машыну, каб не параніць пальцы.

Дым і агонь заўсёды выклікаюць ***трывогу***. Не бывае дыму без агню. Калі вы заўважылі дым або агонь, тэрмінова паведаміце пра гэта дарослым. Яны могуць патушыць агонь: заліць вадой, засыпаць пяском.

Калі полымя не ўдаецца адразу потушыць, выбягайце на двор. Не забудзьце папярэдзіць суседзяў. Звярніцеся па дапамогу да прахожых. Пажарных выклікаюць па тэлефоне ***101***. Пры гэтым хутка і выразна трэба паведаміць, ***дзе*** гарыць, ***што*** гарыць, ***хто*** выклікае пажарных.








Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Калі вы ўдарыліся, трэба дапамагчы сабе. Прыкладзіце да месца ўдару халодны прадмет. Напрыклад, змочаную халоднай вадой сурвэтку або кавалачак лёду. Патрымайце сурвэтку або лёд 10—15 мінут.

1. Разгледзьце малюнак. Па якіх прычынах можа ўзнікнуць пажар? Што трэба рабіць, калі заўважылі пажар?

2. Якая небяспека можа падсцерагаць дома?

3. Дайце параду аднакласніку, як пазбегнуць траўмаў на школьным перапынку.

4. Што вы робіце, каб не патрапляць у небяспечныя сітуацыі ў школе (дома)?

5. Як дапамагчы пры нямоцным удары?

**Небяспе́ка, папярэ́дзіць, электрапрыбо́р, апёк, няшча́сны вы́падак.**

Абмяркуйце, што вы зробіце, калі заўважылі дым, які ідзе з-пад даху дома. Як правільна выклікаць пажарных? У якіх выпадках іх выклікаюць?

Патрэніруйцеся дапамагаць пры невялікім раненні. У першую чаргу ранку трэба апрацаваць. Для гэтага вымыйце рукі з мылам. Вазьміце з аптэчкі шматок ваты, ***раствор ёду*** або ***зялёнкі***.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Змачыце вату ёдам або зялёнкай. Акуратна змажце скуру вакол ранкі. **Памятайце!** Весці ватку трэба ад ранкі да краёў, а не наадварот. Калі неабходна, забінтуйце ранку. Можна наклеіць на яе спецыяльны ***пластыр***. Калі рана вялікая, папрасіце дапамогі ў дарослых.

## 4. Прафілактыка няшчасных выпадкаў на вуліцах (на дарогах)

Чаму здараюцца няшчасныя выпадкі на вуліцах і дарогах? Якія правілы дарожнага руху павінны выконваць пешаходы?

Па дарозе ў школу і са школы вы бываеце то **пешаходамі**, то **пасажырамі**. Вуліцы і дарогі — месцы ***павышанай*** небяспекі. Тут многа аўтамабіляў і пешаходаў.

На вуліцах (на дарогах) трэба строга выконваць ***правілы дарожнага руху***. Гэта самае лепшае папярэджанне няшчасных выпадкаў. Парушэнне правіл дарожнага руху можа стаць прычынай аварый. За парадкам на вуліцах і дарогах сочаць **інспектары дарожна-патрульнай службы (ДПС)**. За парушэнне правіл дарожнага руху яны караюць пешаходаў і вадзіцеляў.

Пры руху па вуліцы (па дарозе) належыць ісці па **тратуары**, або пешаходнай дарожцы. Пры пераходзе



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

вуліцы (дарогі) не спяшайцеся ступаць на праезную частку — **маставую.** Шлях павінен быць добра і далёка бачны справа і злева.

Вы ўжо ведаеце, што пераходзіць вуліцу (дарогу) можна толькі па спецыяльна абазначанаму пешаходнаму пераходу на зялёны сігнал светлафора. Наземны пераход абазначаюць ***«зебрай»*** і знакам ***«Пешаходны пераход»***. Палоскі на дарозе і дарожны знак паказваюць пешаходам месца перахода. Кіроўцы таксама бачаць знак і палоскі здалёк і прытармошваюць: тут можа з'явіцца пешаход. Самы бяспечны падземны пераход. Ён абазначаецца знакам ***«Падземны пешаходны пераход»***.

Ёсць пераходы і перакрыжаванні без светлафораў. Тут трэба быць асабліва ўважлівым і асцярожным. Пры пераходзе вуліцы або дарогі спачатку







Правообладатель Адукацыя і выхаванне

паглядзіце налева. Пераканайцеся, што шлях злева свабодны. Дойдзеце да сярэдзіны вуліцы — спыніцеся. Паглядзіце направа. Калі справа ад вас аўтамабіляў паблізу няма, завяршыце пераход вуліцы (дарогі).

На шырокіх вуліцах у сярэдзіне пешаходнага пераходу ёсць **«астравок бяспекі»**. Тут можна спакойна перачакаць паток машын.

У некаторых выпадках на перакрыжаванне выходзіць **рэгуліроўшчык**. Ён рэгулюе рух аўтамабіляў і пешаходаў. **Памятайце!** Калі рэгуліроўшчык стаіць да вас тварам або спінай, ісці цераз вуліцу нельга. Пераходзьце вуліцу, калі рэгуліроўшчык павярнуўся да вас бокам.

Не выскоквайце на дарогу з-за стаячых аўтамабіляў, дрэў, кустоў. Вадзіцелі не змогуць убачыць вас загадзя і не паспеюць затармазіць. Спыніць аўтамабіль адразу немагчыма. Можа здарыцца наезд на пешахода.

1. Чаму вуліцу (дарогу) лічаць месцам павышанай небяспекі?

2. Разгледзьце малюнкі на с. 15. Раскажыце, як правільна пераходзіць вуліцу.

3. Прачытайце ў тэксце, як пераходзіць вуліцу (дарогу), каля няма светлафора. Перакажыце сваімі словамі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

4. Для чаго на вуліцы зроблены «астравок бяспекі»?

5. Як пераходзіць вуліцу (дарогу), калі рухам кіруе рэгуліроўшчык?

**Пешахо́д, пасажы́р, тратуа́р, мастава́я, інспе́ктар даро́жна-патру́льнай слу́жбы (ДПС), «астраво́к бяспе́кі», рэгуліро́ўшчык.**

Абмяркуйце, якія дарожныя знакі сустракаюцца на вашым шляху ў школу. Пакажыце, як правільна пераходзіць вуліцу (дарогу), калі няма светлафора. Што вы робіце, каб не патрапіць у небяспечныя сітуацыі па дарозе ў школу (са школы)?

1. Паназірайце за работай рэгуліроўшчыка. Патрэніруйцеся пераходзіць дарогу па яго сігналах.

2. Вывучыце верш. Перакажыце.

Свет зелёный говорит: «Проходите, путь открыт».
Загорелся красный свет: «Стой! Опасно! Хода нет!»

Хлопчык вучыцца ў чацвёртым класе. Аднойчы ён спяшаўся ў школу і выскачыў на праезную частку дарогі. Ці свабодная дарога, ён забыў паглядзець. Нечакана з-за павароту выехала машына...



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Толькі праз тры месяцы хлопчык выпісаўся з бальніцы. Ён няўпэўнена кульгаў на мыліцах. Дактары выратавалі хлопчыку жыццё. Яму зрабілі некалькі аперацый. Але хадзіць нармальна ён ужо ніколі не зможа. А няшчасця магло і не быць. Хлопчык шмат разоў чуў ад дарослых пра асцярожнасць на вуліцы. Але ён думаў, што ўсё гэта марныя размовы і яны яго не тычацца.

## 5. Прастудныя хваробы

Ці даводзілася вам прастуджвацца? Як вы сябе адчувалі падчас прастуды?

Каб расці здаровым, трэба хоць крыху ведаць пра хваробы. Варта ведаць і пра тое, што рабіць, каб не захварэць. У любую пару года чалавека падсцерагаюць ***прастудныя хваробы***. Асабліва часта людзі прастуджваюцца ў сырое надвор'е восенню і вясной. Нікому не падабаецца хварэць. У прастуджанага чалавека з́яўляюцца ***насмарк***, ***кашаль***. У яго баліць горла, павышаецца тэмпература, чырванеюць і слязяцца вочы. Пры прастудзе прападае **апетыт**, з́яўляецца ***слабасць***.

Хворы чалавек павінен лячыцца дома. Яму не варта хадзіць у школу, на працу, у госці. Калі хворы чалавек знаходзіцца сярод здаровых людзей, захварэць могуць і яны. ***Лекі*** трэба прымаць



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



толькі тыя, якія прызначыў доктар. Ён прызначае, як прымаць лекі. Нельга прымаць іх самому, без бацькоў. Колькасць лекаў павінна быць такая, як прапісаў доктар.

! Калі вы адчулі сябе кепска, прыміце меры. Паведамце пра сваё **недамаганне** дарослым. Папрасіце іх дапамагчы вам памераць тэмпературу цела. Калі яна павышана, варта легчы ў пасцель. Не капрызнічайце! Блізкія людзі і так перажываюць за вас. Пры кашлі, чханні прыкрывайце насоўкай або сурвэткай нос і рот.

? 1. У якую пору года людзі прастуджваюцца часцей за ўсё?

2. Назавіце прыкметы прастудных хвароб.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

3. Прачытайце. Адкажыце, што магло стаць прычынай прастуды хлопчыка.

Саша не вымыў рукі перад абедам. Ён вымак пад дажджом і не пераапрануўся ў сухое адзенне. Хлопчык гуляў на дварэ ў мокрым абутку.

4. Назавіце правілы паводзін чалавека падчас хваробы. Карыстайцеся малюнкам на с. 19.

**Апеты́т, недамага́нне.**

Арганізуйце з аднакласнікамі сюжэтна-ролевую гульню «У паліклініцы». Для гэтага вызначце, якія ролі вы будзеце выконваць. (Падказка: у паліклініцы вы — наведвальнікі. Там працуюць дактары, медыцынскія сёстры, ***рэгістратары***.) Дамоўцеся, хто якую ролю будзе выконваць. Вызначце правілы гульні. Падрыхтуйце патрэбныя для гульні прадметы. Гуляйце, выконваючы правілы.

## 6. Грып — небяспечная хвароба

Прачытайце і абмяркуйце сітуацыю. Як вы разумееце вылучаныя словы?

У хлопчыка хваравіты выгляд. У яго баліць галава. Ён чхае. Няўжо гэта **грып**? Нельга ісці ў школу, нельга гуляць з сябрамі! Хлопчык можа ўсіх **заразіць**.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Грып — хвароба, якая перадаецца ад аднаго чалавека да другога праз кашаль, чханне. Прыкметамі гэтай хваробы з’яўляюцца галаўны боль, высокая тэмпература, насмарк, кашаль, слабасць.

Грып небяспечны. Ён можа выклікаць цяжкія **ўскладненні**. Нярэдка пасля грыпу доўга не ўдаецца ***ўзнавіць*** здароўе.

Грып заразны. Гэта значыць, што ад аднаго чалавека заражаюцца многія людзі. Калі адначасова на грып хварэе шмат людзей, то гэта **эпідэмія** грыпу.

Калі вы захварэлі на грып, прыміце меры. Кладзіцеся ў пасцель. Выклікайце доктара. Прымайце лекі, якія прызначыў доктар. Піце больш вадкасці: ваду, чай, сок. Прымайце вітаміны. Часта праветрывайце памяшканне.

1. Назавіце прыкметы грыпу.
2. Прачытайце ў тэксце, чым небяспечны грып. Перакажыце сваімі словамі.
3. Чаму грып — заразная хвароба?

**Грып, заразі́ць, ускладне́нне, эпідэ́мія.**

## 7. Лячэнне прастудных хвароб

Назавіце прыкметы прастуднай хваробы. Як можна пазбавіцца ад хваробы? Што можа здарыцца, калі не лячыць прастуду?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Пры любой хваробе належыць звярнуцца па дапамогу да дарослых (да бацькоў, настаўніка, выхавальніка). Яны выклічуць доктара або выправяць вас да яго. Ён прапіша патрэбныя лекі. Пры наведванні доктара дакладна адкажыце на яго пытанні. Уважліва выслухайце яго парады. Падчас лячэння строга выконвайце ***прызначэнні*** доктара.

Калі прастуду не лячыць, вы можаце захварэць на больш небяспечныя хваробы. Напрыклад, на ***бранхіт*** або ***запаленне лёгкіх***.

Існуюць ***народныя спосабы лячэння*** некаторых хвароб. Напрыклад, пры лёгкай прастудзе добра дапамагае чай з малінавым варэннем. Можна прыгатаваць **вітамінную гарбату** з пладоў ***шыпшыны***. Дапамагае адвар з кветак ліпы, лісця ***падбелу***.

Пры тэмпературы варта піць цёплы чай, цёплае малако з мёдам. Гэта смачна і карысна. Добрымі лекамі пры прастудзе з'яўляюцца цыбуля і часнок. Можна паласкаць горла настоем з кветак ***аптэчнага рамонка***.

Пры насмарку можна папарыць ногі ў вадзе з ***гарчычным парашком***. Можна капаць у нос разбаўлены гатаванай вадой сок пакаёвай расліны **алоэ** або бурака.




Пры кашлю дапамагаюць **інгаляцыі** над парай толькі што



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

зваранай і расцертай бульбы, адвару з лекавых раслін. Напрыклад, з кветак ліпы, наготкаў, аптэчнага рамонка.

Лекавыя травы можна купіць у ***аптэцы***. Як іх ужываць, напісана на ўпакоўцы. Лекавыя расліны можна самім сабіраць і сушыць.

1. Што зробіце, калі ў вас забалела горла?
2. Прачытайце ў тэксце, як пазбавіцца ад прастуды народнымі спосабамі. Перакажыце сваімі словамі з дапамогай малюнка.
3. Прапануйце свайму аднакласніку смачныя лекі ад прастуды. Карыстайцеся малюнкам.
4. Назавіце лекавыя расліны, пра якія гаворыцца ў тэксце.

**Вітамі́нная гарба́та, ало́э, інгаля́цыя.**

Папрактыкуйцеся ў прыгатаванні лекавай гарбаты ад прастуды з малінавага варэння (з сухіх ягад малін або кветак ліпы). Прачытайце і перакажыце сваімі словамі ***рэкамендацыі***, напісаныя на аптэчнай упакоўцы з лекавымі раслінамі.

Папрасіце дарослых пазнаёміць вас з ***дамашняй аптэчкай***. Дзе захоўваюцца лекі? Для



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

чаго неабходна дамашняя аптэчка? Ці можна без дазволу дарослых прымаць вітаміны?

**Памятайце!** Лекі неабходны хворым людзям. Яны могуць пашкодзіць здароўю, калі іх няправільна ўжываць. З лекамі трэба быць асцярожнымі. Нельга прымаць лекі без прызначэння доктара. Належыць прымаць толькі тыя лекі і ў той колькасці, што прапісаў доктар. Ніякія лекі, у тым ліку і вітаміны, нельга браць і ўжываць без дазволу дарослых.

## 8. Прафілактыка прастудных хвароб

Раскажыце, як ***папярэдзіць*** прастуду. Што робіце вы, каб не прастудзіцца?

Кожны чалавек не хоча прастуджвацца. Лёгка прастуджваюцца людзі, якія адзяваюцца не па сезоне, не па надвор'е. Напрыклад, тыя, хто зімой ходзіць без галаўнога ўбору, цёплага шаліка. Тыя, хто ў дажджлівае надвор'е не надзявае адзенне і абутак з непрамакальных матэрыялаў. Прычынай прастуды могуць стаць мокрае адзенне і абутак.

Каб не захварэць, трэба трымацца далей ад тых, хто кашляе і чхае. Пры кашлі, чханні з рота хворага выкідаюцца кропелькі сліны. У ёй знаходзяцца ўзбуджальнікі хвароб. Здаровы чалавек удыхае гэтае паветра і заражаецца.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Прастуджваюцца часцей **незагартаваныя** людзі. Загартоўваюць цела чалавека ***сонца, паветра, вада***. **Загартоўваць** свой арганізм павінен кожны чалавек з дзяцінства.

Для гэтага трэба рэгулярна бываць на свежым паветры. Адзявацца трэба цёпла, але так, каб ***не пацець***. На паветры належыць рухацца: гуляць у ***рухавыя гульні***, займацца ***фізічнай працай***. Летам, вясной, восенню карысна спаць пры адчыненай фортачцы. Зімой — у добра праветраным памяшканні.

Перад сном трэба мыць ногі прахалоднай вадой. Трэба **рэгулярна** абціраць цела вільготным ручніком, прымаць душ. Вельмі карысна займацца фізкультурай. Летам карысна хадзіць **босым**, але толькі ў такіх месцах, дзе няма бітага шкла, цвікоў, трэсак.

! Мала прастуджваюцца або зусім не прастуджваюцца тыя, хто ў халоднае надвор'е надзявае галаўны ўбор, куртку. Куртку, паліто неабходна зашпільваць.



У дажджлівае надвор'е трэба браць з сабой парасон. Калі вы патрапілі пад дождж, пастарайцеся хутчэй пераапрануцца ў сухое адзенне і абутак.

На свежым паветры трэба дыхаць носам, а не ротам. Для здароўя шкодна піць вельмі халодную ваду, есці вельмі халодную ежу.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Што можа стаць прычынай прастуды?

2. Якія правілы трэба выконваць, каб пазбегнуць прастуды?

3. Для чаго людзі займаюцца загартоўваннем?

4. Прачытайце ў тэксце, як можна загартоўваць арганізм. Перакажыце сваімі словамі.

**Незагартава́ны, загарто́ўваць, рэгуля́рна, бо́сы.**

Прачытайце пачатак апавядання. Прадоўжыце апавяданне з дапамогай пытанняў.

Была зіма. Дзеці каталіся на санках з гары. Ніне стала горача. Яна зняла паліто і працягвала гуляць. Хутка ў Ніны замерз нос, ***азяблі*** рукі, застылі ногі. Але дзяўчынка дамоў не спяшалася. Раніцай Ніна не пайшла ў школу. Яна захварэла…

Каго запрасілі да хворай дзяўчынкі? Што выпісаў доктар? Дзе можна ўзяць лекі? Як іх прымаць? Як можна паскорыць выздараўленне? Як можна было пазбегнуць прастуды?

Некаторыя дзеці вельмі лянівы. Калі яны ідуць, то ***цягнуць*** ногі, як старыя. А калі сядаюць за кнігу, то не могуць сядзець прама. То падапруць галаву адной рукой, потым другой, пасля



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

лягуць на стол грудзьмі. Такая слабая ў іх бывае спіна. Чаму так адбываецца?

Таму, што не ўсе дзеці любяць рухацца. Напрыклад, зімой усе снег чысцяць, а гэтыя дзеці стаяць. Вясной людзі двор мятуць, восенню — дрэвы даглядаюць, а яны і не думаюць дапамагаць, пазбягаюць працы. На ўроках фізкультуры яны прыкідваюцца хворымі. Нават выходзячы на двор, яны не бегаюць, а сядзяць на лаўцы і гуляюць на планшэце або на мабільным тэлефоне.

# АЗБУКА ХАРЧАВАННЯ

## 9. Правілы здаровага харчавання

Разгледзьце малюнак. Што есць чалавек? Для чаго яму неабходна ежа? Ці клапоціцеся вы пра сваё харчаванне? Як? Хто клапоціцца пра ваша харчаванне дома (у школе)?





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Для жыцця чалавеку неабходна разнастайная ***ежа***. Разам з ёй у арганізм паступаюць ***пажыўныя рэчывы***. Яны расходуюцца пры руху, працы, занятках фізкультурай і спортам. Затрачаныя рэчывы чалавек павінен пастаянна папаўняць. Дзецям, падлеткам ежа патрэбна яшчэ і для таго, каб расці і развівацца. Ежа — гэта «цаглінкі», з якіх пабудавана цела чалавека.

Чалавек есць некалькі разоў на дзень. Ежа павінна быць не толькі смачнай. Яна павінна быць разнастайнай, карыснай. Карысны для здароўя агароднiна, ягады, садавіна. У іх утрымліваюцца вітаміны. Асабліва патрэбны яны зімой і вясной. У гэты час чалавек спажывае мала свежай зялёніны. Калі якога-небудзь вітаміна ў арганізме чалавека не хапае, ён пачынае хварэць. Прымаць вітаміны з аптэкі варта па прызначэнні доктара. Іх ***лішак*** шкодны для здароўя.

Многа карысных рэчываў утрымліваецца ў чорным хлебе, кашах. Карысны для здароўя малочныя прадукты. Без усіх гэтых прадуктаў не бывае **паўнавартаснага** сняданка, абеду і вячэры. Таму не варта адмаўляцца ад іх.

Не карысны для здароўя вяндліна, газаваныя напоі, чыпсы. Не варта спажываць іх часта і ў вялікай колькасці. Шкодзяць здароўю слодыч, яда **ўсухамятку**, пераяданне. Не варта есці шмат тлустай ежы.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Каб быць здаровым, важна прымаць ежу ў адзін і той час. Стол пажадана прыгожа **сервіраваць**. Не варта адмаўляцца ад каш, хлеба, малочных прадуктаў. Перад ядой трэба абавязкова мыць рукі з мылам. Есці трэба спакойна, добра пераживоўваць ежу. Падчас прыёму ежы не варта размаўляць. Есці належыць не вельмі многа, пераядаць шкодна.

1. Навошта чалавеку патрэбна ежа?
2. Якія прадукты карысны для здароўя, а якія — могуць быць шкодныя?
3. Прачытайце ў тэксце пра правілы здаровага харчавання. Перакажыце сваімі словамі з дапамогай малюнка на с. 27.
4. Што вы ведаеце пра вітаміны?

**Паўнава́ртасны, усухамя́тку, сервірава́ць.**

Вучыцеся сервіраваць стол чаю (абеду). Вучыцеся карыстацца ***сталовымі прыборамі***: лыжкай, відэльцам, нажом. Складзіце і абмяркуйце правілы культурных паводзін за сталом. Ці выконваеце вы гэтыя правілы?

Разам з дарослымі складзіце і абмяркуйце сваё меню на дзень. Ці можна сказаць, што ў вас разнастайная ежа? Што вам хацелася б дадаць да свайго меню?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## 10. Прыкметы і прафілактыка харчовых атручэнняў

Ці балеў у вас жывот? Што стала прычынай гэтаму? Як папярэдзіць боль у жываце?

Часам у чалавека баліць жывот. Прычынай можа быць **атручэнне *няякаснай ежай***. Пры атручэнні чалавека нудзіць. У яго бываюць ваніты, расстройства жывата. Чалавек адчувае слабасць, ***галавакружэнне***. У яго можа павысіцца тэмпература цела. Атруціцца можна нясвежымі прадуктамі. Тое, што прадукты сапсаваны, даведваюцца па іх колеры, непрыемным паху. Многія з іх мяняюць свой смак.

Каб не атруціцца, ніколі не ешце прадукты, якія змянілі свой колер, пах або смак. Не





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

захоўвайце мясныя, рыбныя прадукты ў цёплым месцы, без халадзільніка. Не ешце прадукты, якія пакрыты **цвіллю**.

Ніколі не каштуйце незнаёмыя грыбы і ягады. Мыйце рукі перад ядой. Ешце з чыстага посуду.

Пры любым болю ў жываце трэба звярнуцца да доктара. Пры атручэннях належыць тэрмінова выклікаць урача хуткай дапамогі. Для гэтага трэба пазваніць па тэлефоне ***103***, паведаміць свой адрас, імя, прозвішча. Трэба расказаць, што здарылася, адказаць на пытанні ***дзяжурнага ўрача***, выканаць усе яго ўказанні.

1. Чаму можа забалець жывот?
2. Чым можна атруціцца?
3. Назавіце прыкметы харчовага атручэння.
4. Прачытайце ў тэксце, як пазбегнуць харчовага атручэння. Перакажыце сваімі словамі з дапамогай малюнка.

**Атручэ́нне, цвіль.**

Уявіце, што вы адпачывалі ў лесе. Адна дзяўчынка ўбачыла чырвоныя ягады і пакаштавала іх. Праз нейкі час яе пачало ***ванітаваць***. Ад чаго гэта магло здарыцца? Што трэба зрабіць?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паўторым галоўнае пра здароўе чалавека

Быць здаровым важна. Моцнае здароўе патрэбна кожнаму чалавеку. Калі чалавек здаровы, ён вясёлы, актыўны, бадзёры. Яму лёгка вучыцца і працаваць. Хвароба аслабляе чалавека.

Пра ваша здароўе клапоцяцца бацькі, дактары, настаўнікі. Але лепш за ўсіх паклапаціцца пра яго можаце вы самі. Ваша здароўе ў многім залежыць ад вашых паводзін.

У навакольным свеце шмат небяспекі. Гэта пажары, прастуды, харчовыя атручэнні і г. д. Небяспека падсцерагае чалавека дома, у школе, на вуліцах і дарогах. Чалавек павінен быць уважлівым і асцярожным, каб пазбегнуць няшчасных выпадкаў.

Каб захаваць і ўмацаваць здароўе, трэба выконваць простыя правілы. Напрыклад, трэба адзявацца па сезоне і па надвор'і. Вельмі важна выконваць правілы асабістай гігіены. Трэба есці разнастайную ежу, выконваць рэжым дня. Трэба загартоўваць свой арганізм.

## Праверым сябе

1. Што трэба рабіць для захавання і ўмацавання здароўя?

2. Хто можа паклапаціцца пра ваша здароўе лепш за ўсіх?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

3. Раскажыце, як вы самі клапоціцеся пра сваё здароўе. Як клапоцяцца пра здароўе ў вашай сям'і?

4. Як вы разумееце прыказку: «Не гонись за красотой, тянись к здоровью»?

5. Раскажыце пра правілы харчавання. Назавіце свае любімыя прадукты.

6. Што такое рэжым дня? Для чаго яго трэба выконваць?

7. Як можна пазбегнуць прастуды?

8. Як пазбегнуць траўмаў дома (у школе)?

9. Што трэба рабіць, каб загартаваць свой арганізм?

10. Якая небяспека можа падсцерагаць чалавека на вуліцы (на дарозе)?

11. Як перайсці дарогу, калі няма светлафора?

12. Што трэба рабіць, калі вы ўдарыліся?

13. Што трэба рабіць, каб менш прастуджвацца?

14. Якія правілы дарожных паводзін вы выконваеце па дарозе ў школу і са школы?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА

## МАЯ СЯМ'Я

### 11. Сям'я і родзічы

Разгледзьце малюнак. Назавіце групу людзей, якая намалявана на ім. Каго мы называем бацькамі? Бабулямі? Дзядулямі? Хто больш стары? Хто больш малады? Хто вы для сваіх бацькоў? Хто вы для бабулі? Для дзядулі? Хто вы для брата? Для сястры?





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Кожнаму чалавеку патрэбна **сям'я**. Сям'я — гэта бацькі і дзеці, якія жывуць разам, вядуць агульную гаспадарку. У сям'і разумеюць і падтрымліваюць адзін аднаго, клапоцяцца пра здароўе, дапамагаюць адзін аднаму. Сям'я — самая лепшая абарона ад усіх бед для кожнага ***члена*** сям'і. Сем'і бываюць розныя: вялікія і маленькія. У адных сем'ях двое дзяцей, у другіх — адно дзіця. Ёсць сем'і, у якіх дзяцей трое, чацвёра, пяцёра. Бываюць няпоўныя сем'і. У іх толькі мама або толькі тата займаюцца выхаваннем дзяцей. Аднаму з бацькоў цяжка гадаваць і выхоўваць дзяцей.

Часам у сям'і жывуць дзядулі і бабулі. Гэта бацькі вашых бацькоў. Яны самыя старэйшыя члены сям'і. Дзядулі і бабулі часта хварэюць. Таму неабходна пра іх клапаціцца, дапамагаць ім. Калі ў вашых бацькоў ёсць браты і сёстры, то для вас яны будуць роднымі дзядзькамі і цёткамі. Вы для іх — **пляменнікі**. А іх дзеці — гэта вашы **дваюрадныя** браты і сёстры. Родныя дзядзькі, цёткі, дваюрадныя браты і сёстры — гэта вашы блізкія **родзічы**.

? 1. Раскажыце пра сваю сям'ю, адказваючы на пытанні.

Хто ёсць у вашай сям'і? Як завуць вашых бацькоў? Ці ёсць у вас родныя браты і сёстры? Як іх завуць? Колькі дзяцей у вашай сям'і?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Раскажыце, ці ёсць у вас бабуля і дзядуля. Як іх завуць? Дзе яны жывуць?

3. Ці ёсць у вас дваюрадныя браты і сёстры? Як іх завуць? Дзе яны жывуць?

4. Прачытайце. Вызначце роднасныя адносіны ў парах. Карыстайцеся словамі для даведкі.

Бабуля — ... . Цётка — ... . Брат — ... . Бацька — ... .
*Словы для даведкі:* дачка, пляменнік, унук, сястра.

**Сям'я́, пляме́ннік, дваю́радны, ро́дзіч.**

Прыемна, калі ў сям'і ўсе ўважлівы адзін да аднаго. Тата для мамы прыносіць кветкі. Мама для бабулі шые сукенку. Бабуля вяжа для ўнукаў шкарпэткі, рукавічкі. Дзеці дапамагаюць старэйшым прыбіраць кватэру, выносіць смецце, самі мыюць свае невялікія рэчы. А як у вашай сям'і?

## 12. Клопат членаў сям'і адзін аб адным

Прачытайце і абмяркуйце сітуацыю. Чаму дзецям стала сумна? Як гэта можна выправіць?

Кажа брат сястры: «Не чапай мае машынкі». Адказвае сястра брату: «А ты не чапай мой тэлефон». Дзеці паселі па розных кутах. Але неўзабаве ім абаім стала сумна.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Чалавек не можа жыць без іншых людзей. Самыя блізкія для кожнага з вас людзі — гэта члены вашай сям'і. У любой сям'і дарослыя дапамагаюць дзецям, а дзеці — дарослым. Бацькі клапоцяцца пра дзяцей.

**Клопат** — гэта жаданне і гатоўнасць дапамагчы, зрабіць прыемнае. Бацькі клапоцяцца пра тое, каб у дзяцей былі адзенне і абутак, смачна згатаваная ежа. Клапоцяцца, каб дзеці раслі здаровымі, загартаванымі, каб у іх было ўсё неабходнае для вучобы і адпачынка.

На клапатлівыя адносіны бацькоў дзеці таксама адказваюць клопатам. У добрай сям'і дзеці ўважлівы да сваіх бацькоў, дзядуляў і бабуль. Яны заўсёды пытаюцца, чым могуць дапамагчы, і дапамагаюць. Дзеці стараюцца не засмучаць бацькоў дрэннымі ўчынкамі. Дзеці і бацькі віншуюць адзін аднаго са святамі, з днём народзінаў. Яны дораць адзін аднаму падарункі.

Браты і сёстры ў сям'і па-добраму адносяцца адно да аднаго. **Дабрыня** — гэта жаданне падзяліцца тым, што ў вас ёсць. Гэта адсутнасць ***зайздрасці, сквапнасці***.

Дзеці ў сям'і выхаваны, прыветлівы. Старэйшыя не крыўдзяць і не даюць крыўдзіць малодшых. Яны гуляюць разам, дапамагаюць адзін аднаму ва ўсім. Старэйшыя дзеці з'яўляюцца добрым прыкладам для малодшых. Жаданне і гатоўнасць клапаціцца — важная якасць чалавека.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У сям'і неабходна выконваць правілы культурных **зносін**. Людзі прыдумалі іх, каб адзін аднаго не крыўдзіць. Вельмі важны ў размовах з членамі сям'і ***ветлівыя словы***.

Напрыклад, калі вы пра нешта просіце, кажыце: ***калі ласка, дазвольце мне, вельмі прашу, будзьце ласкавы***.

Падзякаваць можна так: ***дзякуй, вялікі дзякуй, я вельмі ўдзячны***.

Калі вы некага пакрыўдзілі, не адкладайце надоўга выбачэнні. Кажыце: ***прабач, калі ласка; даруй, калі ласка; не крыўдуй***.

Не забывайцеся вітаць сваіх родных раніцай, развітвацца з імі ўвечары перад сном. Словы для вітання могуць быць розныя. Напрыклад, ***добры дзень, добрай раніцы, вітаю, прывітанне***. Словы для развітання: ***да пабачэння, дабранач, усяго найлепшага***.

Пры клапатлівых адносінах, ветлівых паводзінах і зносінах сяброўства і разуменне ў сям'і мацнеюць.

1. Прачытайце ў тэксце, што такое клопат (што такое дабрыня). Перакажыце сваімі словамі.

2. Раскажыце, як у вашай сям'і клапоцяцца адзін аб адным.

3. Як вы клапоціцеся пра старэйшых і маладзейшых членах сям'і?

4. Ці ўмееце вы быць добрымі (ветлівымі)? Прывядзіце прыклады.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

5. Якія правілы культурных зносін вы ведаеце?

6. Прачытайце тэкст. Як вы зрабілі б?

Паспрачаліся дзве сястрычкі.

— Я падам дзядулю вады.

— Не, я падам.

Спрачаліся-спрачаліся, а дзядуля не дачакаўся і сам пайшоў па ваду.

**Кло́пат, дабрыня́, зно́сіны.**

Арганізуйце з аднакласнікамі сюжэтна-ролевую гульню «Дружная сям’я». Вызначце, якія ролі будзеце выконваць. Дамоўцеся, хто якую ролю будзе выконваць. Вызначце правілы гульні. Падрыхтуйце патрэбныя для гульні прадметы. Гуляйце, выконваючы правілы.

Самыя галоўныя ў сям’і, вядома ж, бацькі: тата і мама. Тата — найперш ***абаронца***. Ён абараняе сваю сям’ю, свой дом у выпадку небяспекі, розных непрыемнасцяў. Тата — ***працаўнік***. Ён самы моцны ў сям’і, таму выконвае самую цяжкую працу: пабудаваць дом, узараць агарод, насячы дроў, перасунуць мэблю. Тата абавязаны забяспечваць сям’ю ўсім неабходным. Ён павінен зарабіць грошы на неабходныя для сям’і пакупкі. Разам з мамай тата — ***гаспадар***. Яны разам вырашаюць, калі і якую працу па гаспадарцы выконваць, што купіць.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Мама — самы ***першы чалавек***, з якім сустракаецца народжанае немаўля. Яна вельмі любіць яго, корміць і клапоціцца пра яго. Мама вучыць яго ўсміхацца, хадзіць, гаварыць, трымаць лыжку. Мама — гэта ***першы настаўнік*** і ***галоўны выхавальнік***. Першую песню праспявала, першую казку расказала вам мама. Мама — ***галоўны сямейны доктар***. Гэта яна клапоціцца пра здароўе членаў сям'і. Яна і тэмпературу памерае і лекавы чай прыгатуе. Яна і стрэмку выцягне, і ранку забінтуе. Мама — ***галоўная гаспадыня***. Яна клапоціцца пра ежу і адзенне, вядзе хатнюю гаспадарку, стварае ўтульнасць у доме. А яна ж яшчэ і працуе — грошы зарабляе.

## 13. Абавязкі членаў сям'і

Прачытайце і абмяркуйце сітуацыю. Якія пастаянныя **абавязкі** ёсць у вас дома?

Бацькі на працы. Дома бабуля і дзяўчынка. Бабуля варыць абед, прасуе вымытую бялізну. У яе зусім няма часу на адпачынак. Яна то прыбірае, то мые посуд ці бялізну, то палівае кветкі. Цяжка бабулі. Як быць?

У кожнага члена сям'і ёсць справы, якія трэба ***абавязкова*** выконваць. Іх называюць ***абавязкамі***. Напрыклад, кожнае дзіця абавязаны слухацца сваіх бацькоў, быць да іх уважлівым,



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

 

дапамагаць ім. Бацькі адказваюць за тое, каб дзеці раслі выхаванымі, працавітымі.

У сям'і ўсе павінны працаваць. Дарослыя і дзеці ведаюць свае абавязковыя справы (абавязкі). Шмат дома спраў у мамы. Гэта гатаванне ежы, прыбіранне, мыццё бялізны, пакупкі. А яшчэ трэба пагуляць з дзецьмі. Цяжка маме, калі ніхто ёй не дапамагае. Тата таксама працуе. Ён рамантуе мэблю, ***бытавую тэхніку***, падымае цяжкія рэчы. Ён дапамагае выхоўваць дзяцей, прыбіраць у кватэры. Старэйшыя дзеці гуляюць з малодшымі, ходзяць у магазін, прыбіраюць кватэру. Яны дапамагаюць дарослым даглядаць расліны, свойскіх жывёл.

! Галоўны абавязак школьнікаў — вучоба. Яны стараюцца вучыцца добра, каб у будучыні атрымаць ***прафесію***. Акрамя вучобы, дзеці



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

займаюцца **грамадска карыснай працай**. Яны дзяжураць па класе, па сталовай, працуюць на прышкольным участку.

Дома дзеці абавязаны дапамагаць дарослым па гаспадарцы. У іх абавязкі ўваходзіць трымаць у парадку свае рэчы, паліваць кветкі, выціраць пыл, мыць посуд, выносіць смецце. Жаданне і ўменне дапамагаць — важная якасць чалавека. З узростам у дзяцей мяняюцца іх абавязкі.

1. Прачытайце ў тэксце, што такое абавязкі. Перакажыце.

2. Якія абавязкі ў сям'і ёсць у мамы? У таты? Адкажыце з дапамогай малюнка на с. 41.

3. Раскажыце, як вы выконваеце свае абавязкі дома.

4. Які галоўны абавязак школьнікаў? Як вы яго выконваеце?

5. Уявіце, што вы прыйшлі дамоў са школы раней, чым бацькі з працы. Чым зоймецеся?

**Абавя́зак, грама́дка кары́сная пра́ца.**

Арганізуйце з аднакласнікамі сюжэтна-ролевую гульню «Працоўны дзень у сям'і». Для гэтага вызначце, якія ролі будзеце выконваць. Дамоўцеся, хто якую ролю будзе выконваць. Вызначце правілы гульні. Падрыхтуйце патрэбныя



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

для гульні прадметы. Гуляйце, выконваючы правілы.

1. Прыміце ўдзел у грамадска карыснай працы. Напрыклад, зрабіце парадак на паліцах, у шафах. Вызваліце паліцу (шафу) ад рэчаў. Пратрыце паліцу (шафу) вільготнай сурвэткай унутры і звонку. Вымыйце брудныя цацкі, пратрыце кнігі ад пылу. Акуратна раскладзіце на паліцах (у шафе) вынутыя рэчы. Ацаніце сваю працу. Вымыйце рукі.

2. Прыміце ўдзел у прыбіранні кватэры. Вільготнай сурвэткай вытрыце пыл з падваконнікаў, мэблі. Пры дапамозе пыласоса выдаліце пыл з дываноў. Пратрыце вільготнай анучай падлогу. Пастаўце пыласос на месца. Памыйце і развесьце прасушыць анучу. Ацаніце сваю працу. Вымыйце рукі. **Памятайце!** Для выцірання пылу з мэблі і для мыцця падлогі павінны быць асобныя сурвэткі або анучы.

З вечара я сам чышчу свае чаравікі і туфлі малодшай сястры. Раніцай сам засцілаю сваю пасцель. Дапамагаю маме на кухні. Выводжу выгуляць сабаку. Кармлю ката і прыбіраю за ім. Бацькі дзякуюць мне і пры гэтым кажуць, што мая галоўная справа — за партай у школе. Што гэта значыць?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## 14. Сумесны адпачынак

Разгледзьце малюнак. Чым можна заняцца ўсёй сям'ёй у вольны час? Які адпачынак вам найбольш падабаецца? Чаму?





Дома людзі не толькі працуюць, але і адпачываюць. Адпачываць трэба абавязкова кожны дзень. Чым лепш чалавек адпачне, тым лепш ён потым будзе працаваць. Адпачываюць людзі таксама ў выхадныя і святочныя дні. Адпачываць можна па-рознаму. Адпачынак — не вельмі простая справа. Важна, каб ён прыносіў карысць вам і іншым членам сям'і, а не стамляў яшчэ больш.

У вольны час добра адпачываць усёй сям'ёй. Летам цікава ўсім разам купацца, загараць, збіраць



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

грыбы і ягады. Можна ўсёй сям'ёй пайсці ў паход, на экскурсію. Зімой — катацца на лыжах, схадзіць у кіно, тэатр, музей, на выставу.

Можна добра адпачыць, ладзячы ***сямейныя святы***: дні народзінаў, юбілеі і інш. Галоўнае пры гэтым — зносіны паміж членамі сям'і. Цікава разам слухаць музыку, выконваць любімыя песні, гуляць у шахматы, шашкі, марскі бой і іншыя цікавыя гульні.

У кожнага чалавека ёсць свае ***захапленні***, любімыя заняткі, **хобі**. Адны любяць маляваць, вязаць. Другія — чытаць кнігі, падарожнічаць, хадзіць у тэатры, музеі.

Можна адпачываць у экрана тэлевізара. Перадачы бываюць дзіцячыя і дарослыя. Некаторыя з іх цікавыя для ўсіх. Вось іх і варта глядзець разам з іншымі членамі сям'і. Такія перадачы **вучаць жыццю**. Пасля іх прагляду людзі дзеляцца **ўражаннямі**. Нельга глядзець перадачы ўсе запар. Гэта шкодзіць здароўю.

У кожным доме, кожнай сям'і ёсць кнігі. Сямейнае чытанне — добры адпачынак. З кніг мы даведваемся шмат цікавага, новага, невядомага. Не дарэмна кажуць: «Хто многа чытае, той шмат ведае».



Падчас адпачынку карысна займацца не адной, а рознымі справамі. Напрыклад, доўгі



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

адпачынак ля тэлевізара і занияткі на камп'ютары дрэнна ўплываюць на здароўе. Калі глядзець тэлевізар і работаць з камп’ютарам доўга, стамляюцца вочы, можа забалець галава, парушыцца сон. Замест сіл з’яўляецца ***стомленасць***. Для ўмацавання здароўя важна чаргаваць розныя віды заняткаў. Напрыклад, можна паглядзець тэлевізар, потым пагуляць з мячом на спартыўнай пляцоўцы.

Важна ўмела выбраць час для адпачынку. Шумныя гульні не падыходзяць, калі хтосьці спіць або хварэе. Непажаданы яны і ў позні час, перад сном.

1. Прачытайце ў тэксце, чым можна заняцца ў вольны час усёй сям’ёй. Перакажыце сваімі словамі.

2. Раскажыце, як адпачываюць у вашай сям’і.

3. Чым любяць займацца ў вашай сям’і ўвечары?

4. Як вы праводзіце выхадныя і святочныя дні?

**Хóбі, вучы́ць жыццю́, ура́жанне.**

Абмяркуйце, якія кнігі вы нядаўна прачыталі. Якія дзіцячыя тэлеперадачы паглядзелі? Падзяліцеся сваімі ўражаннямі.

Адпачынак ля тэлевізара трэба правільна арганізоўваць. Для гэтага вазьміце праграму тэлеперадач. Адзначце ў ёй цікавыя для вас перадачы.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Глядзіце тэлевізар не больш за гадзіну ў дзень. Сядайце ля тэлевізара на адлегласці не менш за 3 метраы ад экрана.

З дзецьмі звычайна выходзяць на прагулку іх бабулі або дзядулі. Бывае, што дзеці не заўсёды слухаюцца іх. Напрыклад, я аднойчы бачыў, як хлопчык крыўдзіў сваю бабулю. Бабуля прасіла яго пайсці дамоў, а хлопчыку хацелася залезці на лесвіцу. Каб зрабіць сваё, ён грубіў, капрызнічаў, адбіваўся ад бабулі. Ён так пакрыўдзіў бабулю, што ёй хацелася заплакаць. Чамусьці маленькія часта крыўдзяць дарослых, якія іх любяць. Напрыклад, бабулю, маму, тату або дзядулю.

## Паўторым галоўнае пра сям'ю

Кожнаму чалавеку патрэбна сям'я. Сям'я — гэта бацькі і дзеці, якія жывуць разам. Блізкія родзічы — гэта дзядулі і бабулі, родныя і дваюрадныя браты і сёстры. Члены сям'і клапоцяцца адзін пра аднаго, дапамагаюць адзін аднаму.

Бацькі клапоцяцца пра тое, каб дзеці раслі здаровымі, каб у іх было ўсё неабходнае для жыцця. На клапатлівыя адносіны бацькоў дзеці таксама адказваюць клопатам. У добрай сям'і дзеці і ўнукі ўважлівы да сваіх бацькоў, дзядуляў і бабуль. Браты і сёстры ў сям'і па-добраму адносяцца адно да аднаго. Старэйшыя дзеці — добры прыклад для малодшых.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Жаданне і гатоўнасць клапаціцца, дапамагаць — важныя якасці чалавека. У сям'і неабходна выконваць правілы культурных зносін.

У кожнага члена сям'і ёсць свае абавязкі. У сям'і ўсе павінны працаваць. У добрай сям'і дарослыя і дзеці ведаюць свае абавязкі і выконваюць іх без напаміну. Галоўным абавязкам школьнікаў з'яўляецца вучоба. Яны стараюцца добра вучыцца, каб у будучыні атрымаць прафесію. Акрамя вучобы, дзеці абавязаны дапамагаць дарослым па гаспадарцы. У іх абавязкі ўваходзіць трымаць у парадку свае рэчы, паліваць кветкі, выціраць пыл, мыць посуд, выносіць смецце. З узростам у дзяцей мяняюцца абавязкі.

Члены любой сям'і не толькі працуюць, але і адпачываюць. Добра адпачываць усёй сям'ёй. Можна ўсім разам адпачыць на прыродзе, схадзіць у кіно, тэатр, музей, на выставу. Добры адпачынак — чытанне кніг. Для ўмацавання здароўя важна чаргаваць розныя віды заняткаў падчас адпачынку. Напрыклад, заняткі за камп'ютарам трэба чаргаваць з рухавымі гульнямі на свежым паветры. Сумесная праца і адпачынак, клапатлівыя адносіны адзін да аднаго, ветлівыя паводзіны і зносіны ўмацоўваюць сям'ю, робяць яе больш шчаслівай.

## Праверым сябе

1. Раскажыце пра сваю сям'ю. Хто ў сям'і старэйшы? Хто маладзейшы? Хто вы для сваіх блізкіх родзічаў?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Раскажыце пра сваіх бацькоў. Як вы клапоціцеся пра іх?

3. Раскажыце пра сваіх братоў і сясцёр. Якія добрыя справы вы робіце дзеля іх?

4. Раскажыце пра сваіх дзядулю і бабулю. Што вы робіце разам з імі?

5. Раскажыце, як вы праводзіце выхадныя дні.

6. У каго ў вашай сям'і больш спраў? Чаму трэба дапамагаць дарослым членам сям'і? Якую працу па доме вы выконваеце?

7. Якія ветлівыя словы вы гаворыце сваім блізкім?

8. Як вы паказваеце ўдзячнасць сваім блізкім за клопат пра вас?

9. Як вы разумееце словы: «Добраму слову — добры адказ»?

10. Што вы скажаце ў наступных сітуацыях?

Вы прачнуліся раніцай і ўбачылі маму.
Сабраліся ўсёй сям'ёй на абед і селі за стол.
Вы кладзецеся спаць, да вас падышла мама.

# ПРАЦА ЛЮДЗЕЙ

## 15. Прафесіі работнікаў школы

Раскажыце, хто працуе ў школе. Што робіць кожны з работнікаў школы? У якіх памяшканнях яны працуюць?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Школа — гэта не толькі школьны будынак, светлыя прасторныя класы, чысты школьны двор, **утульная** сталовая. У школе вас сустракаюць дарослыя людзі, якія тут працуюць.

Кіруюць усёй работай у школе ***дырэктар*** і яго ***намеснікі*** (завучы). ***Настаўнікі*** праводзяць урокі. Яны вучаць вас чытаць, пісаць, лічыць, рашаць задачы. ***Выхавальнікі*** дапамагаюць вам выконваць дамашнія заданні, гуляюць з вамі. З імі вы ходзіце на прагулкі, экскурсіі.

Працуе ў школе ***бібліятэкар***. Ён дапамагае вам выбіраць цікавыя і патрэбныя кнігі. Ён дапамагае праводзіць школьныя святы.

Вялікую працу ў школе выконваюць ***прыбіральшчыкі***. Яны сочаць за чысцінёй, мыюць



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

прадлогу, выціраюць пыл. Парадак на школьным двары патрымлівае ***дворнік***. Ён падмятае, прыбірае сухое лісце і смецце. Зімой дворнік чысціць двор ад снегу.

***Повары*** стараюцца накарміць вас смачнай і карыснай ежай. На працу яны прыходзяць вельмі рана. Трэба ж паспець прыгатаваць сняданак і абед для вялікай колькасці людзей. Дапамагаюць поварам ***кухонныя рабочыя***.

У кожнай школе ёсць медычны кабінет. Там працуюць ***дзіцячы ўрач*** і (або) ***медычная сястра***. Яны сочаць за вашым здароўем. Пры неабходнасці заўсёды прыходзяць вам на дапамогу.

У школе ёсць і іншыя работнікі. Напрыклад, ***электрык*** сочыць, каб ва ўсіх школьных памяшканнях гарэлі лямпачкі. Правярае, ці **спраўна** працуюць выключальнікі і разеткі. Ён рамантуе электрапрыборы. ***Сталяр*** рамантуе школьную мэблю: сталы, крэслы, шафы. Ён умела карыстаецца малатком, адвёрткай.

1. Людзі якіх прафесій працуюць у школе?

2. Як вы можаце дапамагчы работнікам школы? Адкажыце з дапамогай малюнка.

3. Раскажыце пра працу аднаго з работнікаў школы. Карыстайцеся планам.

Назавіце імя і імя па бацьку работніка. Дзе знаходзіцца яго рабочае месца? Якую працу ён выконвае? Якімі



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

інструментамі (прадметамі) карыстаецца ў сваёй працы? Як мы (школьнікі) можам яму дапамагчы?

**Уту́льны, спра́ўна.**

**Складзіце сказы, выбіраючы адпаведныя словы з кожнага радка.**

Настаўніца, повар, урач, бібліятэкар.

На кухні, у бібліятэцы, у класе, у медычным кабінеце.

Лечыць, вучыць, гатуе абеды, выдае кнігі.

1. Пры неабходнасці ў школе можна звярнуцца па медычную дапамогу. Для гэтага папярэдзьце настаўніка або выхавальніка, куды вы ідзяце. Выпраўляйцеся ў медычны кабінет. Перш чым увайсці, пастукайце. Павітайцеся, уваходзячы ў кабінет. ***Праўдзіва*** раскажыце, што вас непакоіць. Уважліва выслухайце парады доктара. Падзякуйце і развітайцеся. Выконвайце парады доктара.

2. Прыміце ўдзел у прыбіранні свайго класа. Для гэтага прыбярыце крэйду з дошкі. Вымыйце дошку, мяняючы ваду. Вытрыце пыл з падваконнікаў, сталоў. Зрабіце парадак на паліцах, у шафах. Прыбярыце смецце ў партах, сталах. Ацаніце сваю працу.

Наш клас знаходзіцца на другім паверсе. Побач з класам — школьная бібліятэка. На вялікім пе-



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

рапынку і пасля ўрокаў мы часта туды ходзім. У бібліятэцы мы чытаем, глядзім часопісы, газеты, кнігі. Адзін раз у тыдзень вучні нашага класа мяняюць кнігі. Дапамагае ім у гэтым наша бібліятэкар. За год мы прачыталі шмат цікавых кніг. На ўроках чытання мы абмяркоўваем прачытаныя кнігі. А як у вас?

## 16. Прадметы, створаныя чалавекам

Назавіце вырабы (рэчы), якімі мы карыстаемся ў паўсядзённым жыцці? Хто іх зрабіў?

Кожны дзень мы карыстаемся многімі прадметамі: адзеннем, мэбляй, посудам, інструментамі, цацкамі. Яны называюцца ***вырабамі*** або ***рэчамі***. Без іх жыццё людзей немагчыма. Рэчы вырабляюць на фабрыках, заводах, у майстэрнях. Там працуюць рабочыя розных прафесій.

Вырабы нам неабходны. Яны робяць наша жыццё больш зручным, цікавым. Кожная рэч мае ***практычнае значэнне***. Напрыклад, крэсла створана для таго, каб сядзець на ім. Шафы і шафкі патрэбны для захавання бялізны, вопраткі, посуду. Посуд неабходны людзям для таго, каб гатаваць у ім ежу, есці з яго. Падушка, коўдра, матрас — каб было зручна спаць.

Для працы швачцы патрэбна іголка. Сталяру — малаток, піла. Дворніку — мятла.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Купляючы рэчы, людзі звяртаюць увагу на іх прыгажосць, карыснасць. Людзі падбіраюць рэчы па прызначэнні, колеры, ***фасоне***, матэрыяле. Многія рэчы людзі ствараюць спецыяльна для дзяцей. Дзеці кожны дзень гуляюць з цацкамі. Школьнікі карыстаюцца вучэбнымі прыладамі. Існуе дзіцячае адзенне, дзіцячы абутак, кнігі для дзяцей і многае іншае.

Усе новыя рэчы прыгожыя, чыстыя. З часам у акуратнага гаспадара нават старыя рэчы выглядаюць, як новыя. Таму што чалавек іх беражэ, даглядае. У яго ў доме незапыленая мэбля, на паліцах прыгожа расстаўлены чысты посуд. Расхістанае крэсла адрамантавана.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Адзенне развешана ў шафе на вешалках і раскладзена на паліцах. Абутак высушаны і вычышчаны. З часам рэчы **зношваюцца**. Асабліва хутка яны робяцца **непрыгоднымі**, калі іх не берагуць. У неахайных, неакуратных людзей рэчы патрапаныя, са згубленымі дэталямі. У такіх гаспадароў можна бачыць адарваную кішэню на куртцы, кашулю без некалькіх гузікаў, запэцканы абутак. Гэтыя людзі не клапоцяцца пра знешні выгляд. Яны не чысцяць абутак, не рамантуюць адзенне. Ім даводзіцца часта купляць новыя рэчы. А гэта дадатковыя расходы.

Рэчы робяць з розных **матэрыялаў**: з ***драўніны, шкла, металу, пластмасы, тканіны***. Кожны матэрыял мае свае **ўласцівасці**. Адзін трывалы, але цяжкі, напрыклад метал. Другі матэрыял лёгкі, але крохкі, напрыклад пластмаса. Трэці — непрамакальны, але не прапускае паветра, напрыклад ***гума***. Людзі ўлічваюць уласцівасці матэрыялаў пры вырабе рэчаў.

Кожная рэч праходзіць доўгі шлях, каб стаць прыгожай, зручнай. Кожная рэч, любы выраб — вынік чалавечай працы. Каб стварыць выраб, даводзіцца нямала папрацаваць. Патрэбны спецыяльныя веды, умелыя рукі. Таму да кожнага вырабу неабходна адносіцца беражліва. Працу людзей трэба паважаць. Гэтаму неабходна вучыцца з дзяцінства.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Пры карыстанні рэчамі трэба ведаць, з чаго яны зроблены. Напрыклад, шкло крохкае. Яно разбіваецца ад удару. Вострымі аскепкамі шкла можна параніцца. Папера лёгка мнецца і рвецца. Таму трэба быць акуратнымі з кнігамі, сшыткамі. Металічныя вырабы награюцца. Імі можна апячыся. Пластмаса ад высокай тэмпературы ***плавіцца***. Таму нельга наліваць гарачую ваду ў пластмасавы посуд.

1. Назавіце вырабы, якія ёсць вакол вас. Успомніце іншыя вырабы, якіх побач няма. Адкажыце з дапамогай малюнка на с. 54.

2. Для чаго людзям патрэбны рэчы? Дакажыце, што кожная рэч мае практычнае значэнне.

3. З якіх матэрыялаў робяць рэчы? Прывядзіце прыклады пластмасавых (металічных, драўляных) вырабаў.

4. Назавіце вырабы з гліны (з тканіны, паперы, шкла).

5. Чаму да навакольных рэчаў неабходна адносіцца беражліва?

**Знасі́цца, непрыго́дны, матэрыя́л, уласці́васць.**

Патрэніруйцеся вызначаць і называць матэрыялы, з якіх зроблены навакольныя рэчы.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Абмяркуйце, як вы даглядаеце свае рэчы. Ці ўмееце вы самі рамантаваць паламаныя рэчы?

Дома распытайцеся бацькоў пра іх працу. Кім працуюць бацькі? Што яны вырабляюць? Як яны навучыліся сваёй прафесіі?

Доўгі шлях праходзяць рэчы, перш чым трапляюць да нас. Напрыклад, каб зрабіць драўляную мэблю, у лясах спілоўваюць дрэвы. У іх абсякаюць галіны. Доўгае бярвенне грузяць на ***лесавозы*** і вязуць на лесапільны завод. Там бярвенне распілоўваюць на дошкі. Яны выходзяць нягладкімі, ***шурпатымі***. Дошкі ***габлююць, шліфуюць***.

На мэблевай фабрыцы з гладкіх дошак па чарцяжах выпільваюць ***дэталі*** мэблі. Іх збіраюць, і атрымліваецца стол, шафа або табурэтка. Гатовыя прадметы мэблі фарбуюць, пакрываюць ***лакам*** і вязуць у мэблевыя магазіны.

Другі прыклад. Каб вырабіць ***ільняныя*** абрусы, ручнікі, сшыць сукенкі, на палях вырошчваюць ***лён***. Чаго толькі ні робяць са сцёбламі лёну, каб атрымаць з іх роўныя мяккія ***валокны***! Сцёблы лёну вымочваюць у вадзе. Іх мнуць, трэплюць, ачэсваюць. Усё гэта робяць спецыяльныя машыны. Ільняное валакно вязуць на ткацкія фабрыкі. Там з яго скручваюць ніткі. З нітак на ткацкіх станках ткуць ільняное палатно. З яго на швейных фабрыках шыюць ільняныя вырабы.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## 17. Хто вырабляе прадукты харчавання

Раскажыце, што вы елі сёння на сняданак. З чаго прыгатаваны стравы, якія вы елі? Як прадукты харчавання трапляюць да нас на стол?

Кожны дзень мы ядзім разнастайную ежу. Яна неабходна нам для жыцця. Каб атрымаць прадукты харчавання, людзі вырошчваюць расліны, разводзяць свойскіх жывёл. З іх атрымліваюць раслінныя, малочныя, мясныя прадукты.

Наш галоўны прадукт харчавання — хлеб. Хлебабулачныя вырабы людзі спажываюць кожны дзень. Мы купляем хлеб у магазіне. Каб патрапіць у магазін, бохан хлеба праходзіць доўгі шлях.

У дождж і спякоту працуюць **сельскія жыхары** ў полі. Яны сеюць зерне, даглядаюць усходы, убіраюць ўраджай. Трэба шмат сіл і цярпення, каб ураджай атрымаўся. Яго вырошчваюць людзі розных прафесій. ***Трактарысты*** аруць зямлю, сеюць насенне. **Паляводы** выдаляюць пустазелле, падкармліваюць пасевы ўгнаеннямі. Ураджай збожжа з палёў прыбіраюць ***камбайнеры***. Збожжа на млын перавозяць на грузавіках ***вадзіцелі***. Там ***млынары*** ператвараюць збожжа ў муку. Яе перавозяць на хлебазаводы, дзе працуюць ***пекары***. З хлебазаводаў хлебабулачныя вырабы вязуць у магазіны.

Малочныя, мясныя прадукты, яйкі таксама вязуць у горад з вёскі. **Жывёлаводы** на фермах



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



разводзяць кароў, свіней, курэй. З фермы малако ў спецыяльных **цыстэрнах** вязуць на малочныя заводы. Там яго перапрацоўваюць у розныя малочныя прадукты. У малочныя аддзелы магазінаў паступае сметанковае масла, тварог, ёгурт, смятана, сыр. З магазінаў гэтыя карысныя для здароўя прадукты харчавання паступаюць да нас на стол.






Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Працу людзей на палях і фермах палягчаюць розныя машыны і механізмы. Іх прыдумваюць **інжынеры** і вырабляюць ***рабочыя*** на заводах у горадзе. Праца людзей розных прафесій узаемазвязана. Горад дапамагае вёсцы, вёска дапамагае гораду.

Да прадуктаў харчавання трэба адносіцца беражліва. На іх выраб затрачана праца многіх людзей. Шмат сіл людзей розных прафесій укладзена ў лустачку духмянага хлеба, слоік ёгурту. Каб не выкідаць прадукты, трэба браць іх на талерку невялікімі порцыямі. Мала — папрасіце дабаўкі.

1. Прачытайце схему. Прывядзіце прыклады раслінных (малочных, мясных) прадуктаў харчавання.

Прадукты харчавання

раслінныя малочныя мясныя

2. Чаму хлеб — галоўны прадукт харчавання? Як вы яго беражаце?

3. Назавіце прафесіі людзей, якія вырабляюць прадукты харчавання.

4. Як звязана праца сельскіх жыхароў з працай людзей у горадзе?

5. Раскажыце, адкуль прыходзяць на стол прадукты харчавання.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Се́льскі жыха́р, палявóд, жывёлавóд, цыстэ́рна, інжыне́р.**

Абмяркуйце, з якіх раслін атрымліваюць прадукты харчавання. Раскажыце пра сваю любімую страву. З чаго яе гатуюць? Дзе бяруць гэтыя прадукты? Раскажыце, якіх свойскіх жывёл разводзяць людзі.

З чэрствага белага хлеба можна прыгатаваць смачныя грэнкі. Для гэтага пад наглядам дарослых нарэжце хлеб тонкімі лустачкамі. Намачыце лустачкі ў малацэ. Абсмажце з абодвух бакоў на алеі да атрымання румянай скарынкі. Пасыпце грэнкі цукрам на смак. Смачна есці!

Бацька Пеці і Сярожы — трактарыст. Аднойчы ён узяў дзяцей з сабой. Прыехалі ў поле. Засыпалі ў сеялку зерне. Разраўнялі яго па ўсёй скрыні.

— А што гэта будзе? — спыталі хлопчыкі.

— Каша манная, — усміхнуўся бацька.

Хлопчыкі разжавалі некалькі зярнят і выплюнулі іх. Бацька смяецца:

— Можа, вы думаеце, што і булкі растуць на дрэвах? Да кашы яшчэ далёка. Спачатку насенне



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



трэба пасеяць. Потым пшаніца павінна вырасці. Потым ураджай трэба ўбраць. Зерне прасушыць, ад лупіны ачысціць. Разрэзаць кожнае зерне на дробныя крупінкі. Гэта і будуць манныя крупы. З іх можна гатаваць манную кашу.

## 18. Праца школьнікаў

Назавіце прафесіі работнікаў школы. Як вы адносіцеся да іх працы? Як ім дапамагаеце?

Школьнікі таксама працуюць. Галоўная іх праца — вучоба. Гэта нялёгкі занятак. Вучоба таму і



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




праца, што цяжкая. Каб мець добрыя веды, вучыцца трэба кожны дзень. На ўроках неабходна быць уважлівымі, актыўнымі. Трэба акуратна выконваць усе заданні настаўніка. Дома трэба замацоўваць тое, што даведаліся на ўроках. Вучыцца трэба, каб атрымаць прафесію.

Цікавы для школьнікаў ***урокі працы***. На іх дзеці вучацца ствараць рэчы сваімі рукамі. Дзяўчаткі шыюць фартухі, сукенкі. Яны вяжуць шалікі, шкарпэткі, гатуюць смачныя стравы.

Хлопчыкі працуюць у ***сталярнай*** або ***слясарнай*** майстэрні. Яны робяць лаўкі, кармушкі для птушак, шпакоўні. Выразаюць розныя дэталі з металу, рамантуюць мэблю. З вясны да восені школьнікі працуюць на ***прышкольным участку***. Яны дапамагаюць дарослым даглядаць расліны, удзельнічаюць ва ўборцы ўраджаю.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Школьнікі па чарзе ***дзяжураць*** у школе, сталовай. Яны сочаць за чысцінёй і парадкам у класах, іншых памяшканнях. У сталовай дзеці разносяць стравы з ежай, **сервіруюць** сталы. Дзяжурныя прыбіраюць брудны посуд. Гэта добрая дапамога дарослым.

Трэба з дзяцінства прывучаць сябе працаваць. Да любой працы варта адносіцца **адказна**. Любую працу трэба выконваць **якасна**. Трэба даводзіць пачатую справу да канца. Не варта адкладаць на потым тое, што можна зрабіць зараз. Нездарма кажуць: калі чалавек любіць працу, справы ў яго ідуць добра.

1. Раскажыце, як працуюць дзеці ў школе.

2. Якой працай у школе падабаецца займацца вам? Чаму?

3. Як вы падтрымліваеце чысціню і парадак у класе (у школе)?

4. Растлумачце сэнс прыказак: «Начал дело — доведи до конца», «Кончил дело — гуляй смело».

**Сервірава́ць, адка́зна, я́касна.**

1. Пакажыце, як правільна мыць класную дошку. Раскажыце, як зрабіць свой клас утульным, прыгожым.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Адрамантуйце кнігу. Калі ў ёй падралася старонка, падклеіць яе можна ліпкай стужкай — ***скотчам***. Для гэтага агледзьце падраную старонку. Вызначце, як яе можна падклеіць. Адрэжце палоску скотчу неабходнай даўжыні. Акуратна злучыце часткі старонкі, сумясціце словы, малюнкі. Склейце скотчам месца разрыву старонкі. Ацаніце сваю працу.

Прыміце ўдзел у прыбіранні школьнага двара. Для гэтага агледзьце школьны двор. Вызначце парадак работы. Які ***інвентар*** вам спатрэбіцца? Граблямі прыбярыце лісце. Мятлой падмяціце дарожкі. Збярыце смецце на газонах. Занясіце смецце ў вызначанае месца. Пастаўце на месца інвентар. Ацаніце сваю працу. Вымыйце рукі.

Хлопчыкі любяць майстраваць розныя рэчы. Яны бяруць дошкі, малаток, цвікі, ***абцугі***. Аднойчы яны зрабілі домік для трусянят. Іншым разам у іх атрымалася паліца для кніг. А яшчэ яны зрабілі скрыню для інструментаў, падстаўку пад ёлку на Новы год. Вось толькі тачка аніяк не выходзіла! Без дапамогі дарослых не абысціся. Ці любіце майстраваць вы?

## Паўторым галоўнае пра працу людзей

Мы жывём сярод працуючых людзей. Працуюць бацькі, суседзі. Працуюць у школах настаўнікі,



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

выхавальнікі. Працуюць прыбіральшчыкі, повары, медычныя работнікі.

У гарадах на фабрыках і заводах працуюць рабочыя розных прафесій. Яны ствараюць навакольныя рэчы, без якіх жыццё людзей немагчыма. Гараджане дапамагаюць сельскім жыхарам. З горада ў вёскі вязуць трактары, камбайны, матацыклы, веласіпеды. Вязуць грузавыя і легкавыя машыны, халадзільнікі, тэлевізары. Усё гэта рабочыя вырабляюць на заводах і фабрыках. Без гэтых тавараў жыццё ў вёсцы немагчыма.

Сельскія жыхары працуюць на палях, фермах. Яны робяць усё, каб у гарадскія і сельскія магазіны паступалі розныя прадукты харчавання: раслінныя, малочныя, мясныя.

Праца кожнага чалавека важна для многіх. Людзі розных прафесій дапамагаюць адзін аднаму. У кожны выраб укладзена вялікая праца. Да вынікаў працы людзей трэба адносіцца беражліва. Чалавека, які працуе, варта паважаць.

Вучоба ў школе — таксама праца. Каб атрымаць прафесію, трэба вучыцца. Добрыя работнікі ўсюды патрэбны. Ужо зараз не трэба баяцца працы і сядзець без справы. Тады ў будучыні можна стаць добрым работнікам.

### Праверым сябе

1. Назавіце прафесіі людзей, якія працуюць у школе.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Раскажыце пра працу сваіх бацькоў.

3. Як прадукты харчавання трапляюць да нас на стол?

4. Адкуль паступаюць у магазіны розныя прадметы, прадукты?

5. Пакажыце на прыкладах, як звязана праца гараджан і праца сельскіх жыхароў.

6. Чаму да навакольных прадметаў трэба адносіцца беражліва?

7. Як вы рыхтуеце сябе да паспяховай працы ў будучыні?

# МОЙ ГОРАД (МАЯ ВЁСКА)

## 19. У горадзе

Разгледзьце малюнак. Раскажыце, што вы ведаеце пра жыццё людзей у горадзе. Як называецца месца (горад, мястэчка, сяло ці вёска), дзе вы жывяце? Назавіце свой адрас.

Людзі ў нашай краіне жывуць у вялікіх і малых гарадах, мястэчках, сёлах, вёсках.

Горад — вялікі **населены пункт**. У ім шмат вуліц, дамоў. Гарадскія вуліцы шырокія. Яны пакрыты **асфальтам** або ***пліткай***. Амаль усе гарадскія дамы ***шматпавярховыя***. У кожным з іх шмат кватэр. У



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



гарадскіх дамах ёсць ***ліфт, смеццепровод***. У кватэрах ёсць халодная і гарачая вада, **ацяпленне.**

У горадзе пражывае шмат людзей. Іх называюць **гараджанамі**. Дарослыя працуюць на фабрыках, заводах, будоўлях. Дзеці вучацца ў школах, гімназіях, ліцэях. Для маленькіх жыхароў горада адкрыты дзіцячыя сады.

У горадзе шмат магазінаў, аптэк, паліклінік. Ёсць музеі, тэатры, стадыёны, бібліятэкі, паркі. На гарадскіх вуліцах шмат машын і пешаходаў. Пасажыраў перавозяць аўтобусы, тралейбусы, трамваі, **маршрутныя таксі.** Аўтамабілі па гарадскіх вуліцах рухаюцца вельмі хутка. Гараджанам трэба



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

быць пільнымі на вуліцах. Яны павінны строга выконваць правілы дарожнага руху.

У гарадскіх дварах, **скверах**, **парках**, уздоўж вуліц пасаджаны дрэвы, кустоўе, кветкі. Дзеці ў дварах гуляюць у пясочніцах, займаюцца на спартыўным абсталяванні. Людзі беражліва адносяцца да ўсяго, што навокал іх.

1. Раскажыце пра свой горад.
2. Ці падабаецца вам ваш родны горад? Чым?
3. Прачытайце ў тэксце, як выглядае гарадская вуліца. Перакажыце сваімі словамі.
4. Чаму гараджанам трэба быць асабліва пільнымі на вуліцах?
5. Якія правілы пешаходаў вы ведаеце і выконваеце?

**Насе́лены пункт, асфа́льт, ацяпле́нне, гараджа́нін, маршру́тнае таксі́, сквер, парк.**

Абмяркуйце, якія месцы ў вашым горадзе могуць быць небяспечнымі для жыцця і здароўя дзяцей. Чаму? Якая небяспека можа падсцерагаць дзяцей у гэтых месцах? Як яе пазбегнуць? Якія месцы бяспечныя?

Разам з дарослымі вывучайце свой горад (сваю вёску). Удзельнічайце ў прыбіранні сваіх двароў, вуліц. Прыміце ўдзел у экскурсіях



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

па сваім родным горадзе. Падчас экскурсій давядайцеся, адкуль узялася назва вашага горада. Як названа галоўная вуліца, плошча? Чаму яны так названы? Дзе знаходзяцца галоўныя ***прадпрыемствы*** горада? Якія помнікі ёсць у горадзе? У гонар каго яны ўстаноўлены? Якія ***спартыўныя аб'екты*** ёсць у вашым горадзе? Што пабудавана спецыяльна для дзяцей? Чым вы ганарыцеся ў сваім горадзе? Якое месца ў вашым горадзе вам падабаецца больш за ўсё?

Бываюць сітуацыі, калі трэба паведаміць пра сябе поўныя звесткі: імя, прозвішча, імя па бацьку, узрост, адрас. Напрыклад, пры паступленні ў школу, пры звароце ў паліклініку. Неабходны гэтыя звесткі ў сітуацыі, якая здарылася з дзяўчынкай.

Прыехала дзяўчынка з мамай з вёскі ў горад за пакупкамі. Народу ў горадзе шмат, можна згубіцца. Моцна трымае дачка маму за руку. Прыйшлі яны ў вялікі чатырохпавярховы магазін. Колькі тут прыгожых рэчаў! І вопратка, і посуд, і цацкі... Падышла дзяўчынка да ***вітрыны*** з лялькамі і забылася пра ўсё на свеце. А калі азірнулася, мамы побач не было. Заплакала дзяўчынка. Сабраліся людзі вакол дзяўчынкі, шкадуюць яе. Паклікалі міліцыянера. Што было далей?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## 20. У вёсцы

Разгледзьце малюнак. Чым адрозніваецца горад ад вёскі? У чым іх падабенства? Раскажыце, што вы ведаеце пра жыццё людзей у вёсцы. Як называецца рэчка ці возера, якія размешчаны недалёка ад вашай вёскі?



Кожны чалавек любіць месца, дзе ён нарадзіўся і жыве. Дом, у якім нарадзіўся і вырас чалавек, называюць бацькоўскім. **Бацькоўскі дом** можа знаходзіцца і ў горадзе, і ў вёсцы. Чалавек робіць усё, каб месца, дзе ён нарадзіўся і вырас, было прыгожым, дагледжаным.

Людзей, якія жывуць у вёсцы, называюць ***сельскімі жыхарамі***. Вёска — невялікі населены



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

пункт. Вуліцы тут не такія шырокія, як у горадзе. Транспарту мала. У адрозненне ад горада ў вёсцы кожны дом прызначаны для адной сям'і. Побач з домам маюцца **гаспадарчыя пабудовы**, сад, агарод, кветнік. Кожны двор у вёсцы абгароджаны. Увайсці ў яго можна толькі цераз брамку. Жыццё ў вёсцы больш спакойнае, чым у горадзе.

Сельскія жыхары працуюць на палях, фермах. Яны вырошчваюць гародніну, садавіну, збожжавыя расліны, разводзяць свойскіх жывёл. Праца сельскіх жыхароў цяжкая. Шмат трэба папрацаваць, каб атрымаць добры ўраджай.

Сельскія жыхары пастаўляюць гараджанам прадукты харчавання. З вёсак у гарады вязуць зерне, гародніну, садавіну, малако, мяса.

1. Раскажыце пра сваю вёску.

2. Прачытайце ў тэксце, чым вёска адрозніваецца ад горада. Перакажыце сваімі словамі. Адкажыце з дапамогай малюнкаў на с. 68, 71.

3. Ці падабаецца вам ваша вёска? Чым?

4. Як сельскія жыхары дапамагаюць гараджанам?

**Бацько́ўскі дом, гаспада́рчая пабудо́ва.**

Не толькі ў горадзе, але і ў вёсцы шмат небяспекі. Абмяркуйце, якія месцы ў вашай вёсцы могуць быць небяспечнымі для жыцця і здароўя дзяцей. Чаму?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Якая небяспека ёсць для дзяцей у гэтых месцах? Як яе пазбегнуць? Якія месцы бяспечныя?

Разам з дарослымі вывучайце сваю вёску. Удзельнічайце ў ***добраўпарадкаванні*** сваіх двароў, вуліц. Чым вы ганарыцеся ў сваёй вёсцы? Якое месца ў вашай вёсцы вам падабаецца больш за ўсё? Чаму?

## 21. Установы горада і вёскі. Магазіны

Што такое магазін? Прачытайце сказы. Выберыце правільны адказ. Перакажыце сваімі словамі.

Будынак, дзе рамантуюць абутак. Месца, дзе паказваюць кіно. Памяшканне, дзе прадаюцца розныя тавары.

У горадзе і вёсцы людзі ходзяць у магазіны. Там яны купляюць розныя тавары. Некаторыя пакупкі можна зрабіць у кіёсках, на рынках.

Магазіны бываюць розныя. У **гастраномах** (***прадуктовых*** магазінах) прадаюць прадукты харчавання. Малако, мяса, рыба, хлеб знаходзяцца ў розных аддзелах аднаго магазіна. Існуюць таксама спецыяльныя магазіны для асобных прадуктаў. У гаспадарчых магазінах прадаюцца тавары для дому. Гэта посуд, інструменты, электратавары, мыйныя сродкі і г. д.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Ёсць магазіны, якія называюць **універмагамі.** Універмаг — гэта ***ўніверсальны*** магазін. Слова «ўніверсальны» абазначае «агульны». Ва ўнівермагу можна купіць розныя тавары: адзенне, абутак, прадукты і многае іншае.

Існуюць і вельмі буйныя магазіны — **гіпермаркеты.** Там можна набыць прадукты і іншыя тавары.

У магазінах працуюць ***прадаўцы.*** Яны прадаюць тавар ***пакупнікам***, пакуюць яго. Пакупнікі разлічваюцца за яго з прадаўцамі. Бываюць **магазіны самаабслугоўвання.** У іх няма прадаўцоў. Пакупнікі самі выбіраюць патрэбныя тавары, складаюць іх у кошык і ідуць да **касы.** Там пакупнікі плацяць грошы за выбраныя тавары. ***Касір*** выдае пакупнікам **чэк.**






Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Калі вы прыйшлі ў магазін самаабслугоўвання з набытымі ў іншым магазіне таварамі, пакіньце іх у **ячэйцы** спецыяльнай шафы. Не ўваходзьце ў ***гандлёвую залу*** з торбамі. Пры ўваходзе ў гандлёвую залу вазьміце спецыяльны кошык.

Калі вы хочаце купіць хлеб, праверце яго свежасць. Для гэтага вазьміце папяровую сурвэтку або спецыяльную лапатачку. Калі іх няма, спытайце прадаўца. **Памятайце!** Хлеб у магазіне нельга чапаць рукамі.

1. Як распазнаць магазіны, ідучы па вуліцы? Хто мы ў магазіне?

2. У якіх магазінах людзі купляюць прадукты харчавання?

3. Што прадаецца ў гіпермаркетах? Адкажыце з дапамогай малюнка.

4. Як распазнаць аддзелы ў магазіне?

5. Раскажыце пра магазіны на вашай вуліцы (у вашай вёсцы).

**Гастрано́м, універма́г, гіперма́ркет, магазі́н самаабслуго́ўвання, ка́са, чэк, ячэ́йка.**

Арганізуйце з аднакласнікамі сюжэтна-ролевую гульню «У магазіне». Для гэтага вызначце, якія ролі будзеце выконваць. Вызначце правілы гульні. Падрыхтуйце патрэбныя для гульні



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

прадметы. Гуляйце, выконваючы правілы. Дапамагайце тым, у каго не атрымліваецца.

Разам з дарослымі наведайце магазін самаабслугоўвання. Даведайцеся, што можна купіць у гэтым магазіне. Якія тут ёсць ***шыльды***, ***указальнікі*** для пакупнікоў. Пра што кажуць вітрыны? Вучыцеся правільна паводзіць сябе ў сітуацыі «Я пакупнік». Самастойна зрабіце пакупку ў магазіне.

Бацькі паабяцалі дачцэ купіць ляльку, а сыну — машынку. Разам яны выправіліся ў магазін. Хлопчык падбег да ***прылаўка*** і закрычаў: «Пакажыце гэта! Не, дайце лепш гэта! Тата, купі мне клюшку! Не, лепш стрэльбу!» Дзяўчынка тузанула маму за рукаў і стала прасіць: «Не хачу гэтую ляльку! Хачу вунь тую, дарагую!» Бацькі ўзялі дзяцей за рукі і павялі да выхада. Дадому яны вярнуліся без пакупак.

## 22. Адпачынак у выхадны дзень

Раскажыце, як вы праводзіце выхадныя дні. Чым любіце займацца ў вольны ад вучобы час?

Пасля працы ці вучобы, у выхадныя і святочныя дні, а таксама ў час канікул і адпачынку



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

людзі адпачываюць. Адпачываць можна па-рознаму. Можна глядзець тэлевізар, займацца на камп'ютары. Але для здароўя больш карысна адпачываць на свежым паветры, на прыродзе: у лесе, парку. Добра пайсці на ***спартыўную пляцоўку***, **стадыён** ці ў **басейн**. Там можна пагуляць у футбол, валейбол, баскетбол, паплаваць або пагля дзець спаборніцтва.

Многія людзі ў вольны час любяць чытаць. Чытанне кніг — добры адпачынак. Кнігі ёсць у любым доме, у любой сям'і. Кожны чалавек можа стварыць сваю бібліятэку. З кнігамі ніколі не бывае сумна. З іх мы даведваемся шмат новага, цікавага. «Хто многа чытае, той шмат ведае», — кажуць людзі. Можна браць кнігі ў бібліятэках. Ёсць дзіцячыя бібліятэкі. Там сабраны кнігі для дзяцей. Самая вялікая ў нашай краіне ***Нацыянальная бібліятэка*** ў горадзе Мінску. Гэта цэлы горад кніг.

У вольны час людзі наведваюць кінатэатры, тэатры, музеі, цырк. З новымі фільмамі і спектаклямі знаёмяць **афішы**, **рэклама**. У тэатры можна паглядзець тэатральнае прадстаўленне — **спектакль**. На сцэне артысты перадаюць падзеі так, як гэта магло б адбывацца ў жыцці. Разам з героямі спектакля гледачы перажываюць іх радасці і беды. Артысты стараюцца, каб спектакль спадабаўся гледачам. Гледачы **апладысментамі** дзякуюць артыстам.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



***Музеі*** бываюць розныя. У ***мастацкіх*** музеях захоўваюцца карціны, скульптуры. У музеі ***прыроды*** можна паглядзець на **чучалы** жывёл, калекцыі насякомых. У **краязнаўчых** музеях захоўваюцца цікавыя матэрыялы, якія расказваюць пра гісторыю горада, краю, краіны. У музеях нельга чапаць рукамі выстаўленыя для паказу рэчы.

У ***цырку*** працуюць гімнасты, фокуснікі, клоўны. Тут выступаюць **дрэсіроўшчыкі** жывёл. Калі глядзіш на выступы артыстаў, усё здаецца простым і лёгкім. На самай справе за гэтай лёгкасцю крыецца ўпартая праца людзей.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Спартыўная пляцоўка, парк, стадыён, басейн, тэатр, музей, бібліятэка, цырк — гэта **грамадскія** месцы. Для кожнага з гэтых месцаў ёсць свае асаблівыя правілы паводзін і зносін. Але галоўнае правіла — трэба паступаць з іншымі так, як хочаш, каб паступалі з табой.

Гэтае правіла вучыць культуры паводзін. Нельга рабіць і жадаць іншаму чалавеку тое, што вам самім непрыемна. Дабро заўсёды дабром вяртаецца. Калі мы навучымся карыстацца гэтым правілам, то грубасці вакол нас будзе менш.

Калі вы сустрэліся з грубасцю, не спяшайцеся злавацца ў адказ, праявіце ***цярпенне***, ***вытрымку***.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У грамадскіх месцах трэба быць ветлівымі, не псаваць настрой іншым людзям. Размаўляць трэба ветліва, спакойна.

Наведваючы грамадскія месцы, трэба быць чыста, ахайна адзетым. Пры ўваходзе ў памяшканне трэба прапускаць наперад дзяўчатак, жанчын, пажылых людзей. У памяшканні належыць здымаць вопратку. У грамадскія месцы не прыходзяць з марожаным і іншай ежай у руках, якія могуць запэцкаць адзенне людзям навокал. У грамадскім транспарце саступаюць месца тым, каму цяжка стаяць: людзям старэйшага ўзросту, маленькім дзецям, інвалідам. **Памятайце!** Да інўых людзей трэба праяўляць ***клопат, добразычлівасць, павагу***.

1. Дзе можна адпачыць у вольны час? Адкажыце з дапамогай малюнкаў на с. 78, 79.

2. Чаму спартыўная пляцоўка, стадыён, басейн, бібліятэка, тэатр, цырк лічацца грамадскімі месцамі?

3. Прачытайце ў тэксце галоўнае правіла паводзін. Перакажыце сваімі словамі. Прывядзіце прыклады.

4. Якія правілы паводзін трэба выконваць у грамадскіх месцах?

5. Якія спартыўныя і культурныя месцы адпачынку ёсць у вашым горадзе (у вашай вёсцы)?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

6. Раскажыце, як вы паводзіце сябе ў грамадскіх месцах.

**Стадыён, басе́йн, афі́ша, рэкла́ма, спекта́кль, апладысме́нты, чу́чала, кале́кцыя, краязнаўчы, дрэсіро́ўшчык, грама́дскі.**

Арганізуйце з аднакласнікамі сюжэтна-ролевыя гульні. Напрыклад, «У тэатры», «У бібліятэцы», «У музеі». Для гэтага вызначце, якія ролі вы будзеце выконваць. (Падказка: у тэатры вы — гледачы. Тут працуюць ***гардэробшчыкі***, касіры, дзяжурныя па зале. У бібліятэцы вы — чытачы. Тут працуюць ***бібліятэкары***. У музеі вы — наведвальнікі. Тут працуюць ***экскурсаводы***.) Дамоўцеся, хто якую ролю будзе выконваць. Падрыхтуйце патрэбныя для гульні прадметы. Агаварыце загадзя правілы гульні. Гуляйце, выконваючы правілы. Але не смейцеся з тых, у каго не атрымліваецца, дапамажыце ім.

Збіраючыся ў тэатр або кіно, неабходна выконваць простыя правілы. Разам з дарослымі паглядзіце ***афішы*** і выберыце для сябе спектакль або фільм. Купіце ў касе білет. Увайшоўшы ў залу для гледачоў, знайдзіце свой рад і месца. Праходзьце на сваё месца тварам да людзей на крэслах. Падчас спектакля ці фільма не размаўляйце гучна.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Не кідайце смецце ў зале. Выкідайце смецце толькі ў спецыяльныя ***урны***. Калі вы прыйшлі з кімсьці, пасля прагляду спектакля або фільма разам абмяркуйце яго.

Хлопчык любіў смяяцца з недахопаў іншых дзяцей. Яму падабалася крыўдзіць, шкоднічаць, ламаць, перашкаджаць. Дзецям было крыўдна да слёз, але яны стараліся не спрачацца з ***грубіянам***. Ён мог і бойку задумаць. Дзеці перасталі гуляць з хлопчыкам. Яны сказалі яму: «Гуляй адзін, сам з сабой. Мы з табой гуляць не будзем».

Сеў хлопчык на лаўку і доўга думаў. Ён успомніў, як хацеў пракаціцца на веласіпедзе, але ў яго не атрымалася. Ён упаў у лужыну. Дзеці не сталі з яго смяяцца, а падбеглі і дапамаглі ўстаць. Іншым разам ён хацеў падцягнуцца на перакладзіне, ды сіл не хапіла. Дзеці сталі яму дапамагаць. Чым больш успамінаў хлопчык, тым больш разумеў, што дзеці маюць рацыю. І ён засмяяўся.

«Гэта я з сябе смяюся. А вы прабачце мне, калі ласка», — сказаў хлопчык. Неўзабаве ён гуляў разам з іншымі дзецьмі. У яго з'явілася шмат сяброў.

## Паўторым галоўнае пра горад (пра сяло, вёску)

Людзі ў нашай краіне жывуць у розных населеных пунктах: вялікіх і малых гарадах, мястэчках,



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

сёлах, вёсках. У горадзе шмат шырокіх вуліц, шматпавярховых дамоў. У гарадскіх дамах ёсць ліфт, смеццеправод, у кватэрах ёсць халодная і гарачая вада, ацяпленне. Гараджане працуюць на фабрыках, заводах, будоўлях. Рабочыя ствараюць вельмі патрэбныя рэчы. З гарадоў у вёску вязуць трактары, веласіпеды, матацыклы, халадзільнікі, тэлевізары.

Кожны чалавек любіць месца, дзе ён нарадзіўся і жыве. Дом, у якім нарадзіўся і вырас чалавек, называюць бацькоўскім. Ён можа знаходзіцца ў горадзе ці ў вёсцы.

Жыццё ў вёсцы больш спакойнае, чым у горадзе. Сельскія жыхары працуюць на палях, агародах, фермах. Яны вырошчваюць агародніінныя, фруктовыя, збожжавыя расліны, разводзяць свойскіх жывёл. Сельскія жыхары пастаўляюць гараджанам прадукты харчавання: хлеб, малако, мяса, гародніну, садавіну.

На вуліцах гарадоў шмат транспарту. Трэба быць асцярожнымі, пільнымі. Кожны чалавек павінен выконваць правілы дарожнага руху.

У горадзе ёсць магазіны, аптэкі, паліклінікі. Ёсць кінатэатры, музеі, тэатры, бібліятэкі, спартыўныя аб’екты. Тут людзі адпачываюць у вольны ад працы і вучобы час, у выхадныя і святочныя дні, у час канікул і адпачынку.

У грамадскіх месцах неабходна выконваць правілы культурных паводзін. Галоўнае з іх:



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

паводзь з іншымі так, як хочаш, каб паводзілі з табой.

## Праверым сябе

1. Чым адрозніваецца горад ад вёскі? У чым іх падабенства?
2. Што вырабляюць на фабрыках і заводах?
3. Чым гараджане дапамагаюць сельскім жыхарам?
4. Чым сельскія жыхары дапамагаюць гараджанам?
5. Якія бываюць магазіны? Дзе можна купіць новае адзенне? У які магазін трэба ісці па прадукты харчавання?
6. Як адпачываюць гараджане? Сельскія жыхары?
7. Раскажыце пра свой горад (пра сяло або вёску). Што вы робіце, каб ваш горад (сяло або вёска) стаў больш прыгожым?
8. Чаму на вуліцах і дарогах трэба быць пільнымі?
9. Вы падышлі да скрыжавання. Светлафора на ім няма. Як будзеце пераходзіць дарогу?
10. Раскажыце, як вы адпачываеце ў вольны час. Як праходзіць выхадны дзень у вашай сям'і?
11. Назавіце галоўнае правіла паводзін у грамадскіх месцах. Назавіце іншыя правілы культурных паводзін і зносін.
12. Чаму трэба быць ветлівымі з людзьмі?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# МАЯ КРАІНА

## 23. Наша Радзіма — Рэспубліка Беларусь

Разгледзьце малюнак. Што на ім намалявана? Абвядзіце ўказкай мяжу нашай Радзімы — Рэспублікі Беларусь. Прачытайце словы на малюнку. Што яны абазначаюць?




Краіна, у якой мы жывём, называецца Рэспубліка Беларусь. Гэта наша **Радзіма**. Тут мы нарадзіліся. Тут мы жывём, вучымся, будзем працаваць. Тут жывуць нашы ***бацькі*** і ***родзічы***. Усё тут для нас ***роднае***. Кіраўніком Рэспублікі Беларусь з'яўляецца **Прэзідэнт**.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Сталіца нашай краіны — **горад-герой** Мінск. Тут працуе наш **урад**. У Мінску жыве каля двух мільёнаў чалавек. Тут шмат вуліц, праспектаў, плошчаў. Галоўнымі з'яўляюцца праспекты Незалежнасці, Партызанскі, Пераможцаў. Упрыгожваюць горад плошчы Незалежнасці, Кастрычніцкая, Перамогі, Якуба Коласа і інш.

У сталіцы шмат прыгожых будынкаў. Напрыклад, Палац спорту, Палац Рэспублікі, Нацыянальная бібліятэка, чыгуначны вакзал, Мінск-Арэна, Чыжоўка-Арэна і інш.




Палац спорту



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Палац Рэспублікі



Нацыянальная бібліятэка



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Чыгуначны вакзал

У Мінску шмат заводаў і фабрык. На іх выпускаюць трактары, аўтамабілі, матацыклы, халадзільнікі, тэлевізары. Тут вырабляюць адзенне, абутак, посуд і іншыя тавары. На вуліцах горада шмат транспарту, пешаходаў. Аўтамабілі рухаюцца хутка. Людзі павінны быць пільнымі пры пераходзе вуліц. У Менску ёсць і падземны транспарт — метро. У сталіцы пастаянна будуюцца новыя раёны, станцыі метро. Мінск прывабны ў любую пару года. Яго вуліцы і плошчы ўпрыгожаны зялёнымі раслінамі. Любімымі месцамі адпачынку **мінчан** і гасцей сталіцы з'яўляюцца ***Batанічны сад***, паркі, скверы, вадаёмы.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Як называецца наша краіна?
2. Чаму мы называем яе сваёй Радзімай?
3. Які горад з'яўляецца сталіцай нашай краіны?
4. Што вы ведаеце пра горад Мінск?
5. Якія цікавыя будынкі ёсць у Мінску? Адкажыце з дапамогай малюнкаў на с. 86—88.

**Радзі´ма, Прэзідэ́нт, го́рад-геро́й, ура́д, метро́, мінча́нін.**

Даведайцеся з дадатковай літаратуры, якія яшчэ краіны ёсць у свеце. Назавіце іх. Што вы ведаеце пра гэтыя краіны?

## 24. Дзяржаўныя сімвалы — сцяг, герб, гімн Рэспублікі Беларусь

Разгледзьце малюнкі. Пакажыце на малюнку **сцяг** Рэспублікі Беларусь. Пакажыце на малюнку **герб** Рэспублікі Беларусь. Раскажыце, дзе вы іх бачылі.








Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Кожная дзяржава мае свае адметныя знакі — **сімвалы**. Гэта сцяг, герб, гімн.

Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь афарбаваны ў чырвоны і зялёны колеры. Чырвоная паласа прыкладна ў два разы шырэйшая за зялёнай. У людзей чырвоную колер заўсёды быў у **пашане**. Гэта колер жыцця, сонца, агню.

Зялёны колер — колер прыроды. Гэта колер лясоў, лугоў, палёў, на якія багата Беларусь. Зялёны колер — колер дабрыні, росту, развіцця. Злева на сцягу намаляваны ўзор з чырвоных **ромбаў** на белым фоне. Гэты ўзор называецца **арнаментам**. Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь лунае ў Мінску над Домам урада. У дні святаў у гарадах і вёсках паўсюль вывешваюць сцягі.

Кожная краіна мае свой герб. На гербе Рэспублікі Беларусь намаляваны зямны шар, асветлены сонцам. Тут намаляваны вянок з каласоў жыта, кветак канюшыны і лёну. Гэта паказвае любоў людзей да працы і веру ў новы ўраджай. Вянок перавіты чырвона-зялёнай стужкай. На ёй напісана назва нашай краіны. Уверсе на гербе намалявана чырвоная зорка — знак **мужнасці**. Герб малююць на важных дакументах. Гэты знак намаляваны і на ***памежных слупах***.

**Гімн** — гэта ўрачыстая песня. Яна гучыць у гонар вельмі важных падзей, герояў. Гімн Рэспублікі



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Беларусь славіць нашу Радзіму, наш народ, яго працу. Гімн выконваюць падчас святаў, у гонар перамог беларускіх спартсменаў. Гімн слухаюць і спяваюць стоячы. Так людзі дэманструюць павагу да сваёй краіны.

1. Прачытайце ў тэксце пра Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь. Перакажыце.

2. Прачытайце ў тэксце пра Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь. Перакажыце.

3. Прачытайце ў тэксце пра Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь. Перакажыце. Успомніце, калі вы чулі гімн Рэспублікі Беларусь.

4. Ці ёсць у вашай школе (у класе) дзяржаўныя сімвалы? Дзе яны размешчаны?

**Сцяг, герб, сі́мвал, паша́на, ромб, арна́мент, му́жнасць, гімн.**

Праслухайце выкананне Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь. Навучыцеся выразна чытаць яго словы. З якой інтанацыяй трэба чытаць гімн?

Вучыцеся распазнаваць Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь сярод іншых сцягоў. Вызначце, ці ёсць на ім два колеры — чырвоны і зялёны. Ці размешчана чырвоная паласа сцяга зверху,



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

а зялёная — унізе? Ці ёсць збоку арнамент? Калі сцяг мае гэтыя прыкметы, то гэта Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь.

## 25. Буйныя гарады Беларусі

Як называецца сталіца Рэспублікі Беларусь? Пакажыце яе на карце Рэспублікі Беларусь. Якія іншыя буйныя гарады нашай краіны вы можаце назваць? Раскажыце, што вы пра іх ведаеце. Пакажыце іх на карце Рэспублікі Беларусь.

Акрамя Мінска ў нашай краіне ёсць іншыя буйныя гарады. Гэта Брэст, Гомель, Віцебск, Гродна, Магілёў. Кожны з іх з’яўляецца цэнтрам вялікай тэрыторыі — **вобласці**. Кожны абласны горад пасвойму прыгожы. У кожным з іх ёсць цікавыя, памятныя месцы.

У гарадах працуюць школы, гімназіі, ліцэі, інстытуты. Пабудаваны **спартыўныя комплексы**, канцэртныя залы, музеі, тэатры, бібліятэкі. У буйных гарадах нашай краіны ёсць фабрыкі і заводы. Тут вырабляюць многія тавары, якія вядомы не толькі ў Беларусі, але і ў іншых краінах. Жыхары Беларусі ганарацца вырабамі сваёй краіны.

Брэст знакаміты сваёй крэпасцю. У гады ***Вялікай Айчыннай вайны*** гэты горад першым



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Брэсцкая крэпасць

прыняў на сябе моцны ўдар ворага. ***Брэсцкая крэпасць-герой*** знаёміць людзей з подзвігам нашых абаронцаў. У Брэсце працуе шмат заводаў, дывановая фабрыка, панчошны камбінат. У Беларусі і іншых краінах вядомы малочныя прадукты маркі «Савушкін».

У Гомелі працуюць заводы па выпуску станкоў, па рамонце вагонаў. Шмат каму вядомая прадукцыя гомельскай **кандытарскай фабрыкі** «Спартак», мэблевай фабрыкі «Прагрэс», прадпрыемства «Гомельскія шпалеры» і інш.

У Віцебску выпускаюць станкі, **вымяральныя прыборы**, медычнае абсталяванне, запасныя часткі



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

для трактароў. Горад славіцца сваімі тэлевізарамі «Віцязь», дыванамі, мэбляй, абуткам. Горад Віцебск — месца правядзення **міжнароднага фестывалю мастацтваў *«Славянскі базар у Віцебску»*.**



На фестывалі мастацтваў
«Славянскі базар у Віцебску»

У Гродне вырабляюць запасныя часткі для аўтамабіляў, ***мінеральныя ўгнаенні***, мэблю, шкло, ствараюць вырабы са скуры і воўны. Тут шмат памятных месцаў, звязаных з гісторыяй Беларусі.

Магілёў — адзін з самых старых гарадоў нашай краіны. Тут вырабляюць ліфты, ***электрарухавікі***. Праводзяць міжнародныя фестывалі музыкі, канцэрты.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Назавіце буйныя гарады Беларусі.

2. Чым славіцца горад Брэст? Віцебск? Адкажыце з дапамогай адпаведных малюнкаў.

3. Якія тавары вырабляюць у буйных гарадах нашай краіны?

4. Чым славіцца горад, у якім вы жывяце або які знаходзіцца недалёка?

**Во́бласць, спарты́ўны ко́мплекс, крэ́пасць, канды́тарская фа́брыка, вымяра́льны прыбо́р, міжнаро́дны фестыва́ль маста́цтваў.**

Арганізуйце з аднакласнікамі завочнае падарожжа «Па гарадах Рэспублікі Беларусь». Для гэтага выберыце горад, пра які вы можаце расказаць. Выберыце транспарт для падарожжа. «Падарожнічайце» ад аднаго горада да другога. Па чарзе расказвайце пра кожны з іх. Калі вы мала ведаеце пра гарады Беларусі, пастарайцеся даведацца пра іх больш. Звярніцеся да дарослых з просьбай дапамагчы вам.

## 26. Славутыя людзі беларускай зямлі

Раскажыце, чым славіцца беларуская зямля і яе людзі. Каго з вядомых беларусаў вы ведаеце?

У Рэспубліцы Беларусь жывуць ***беларусы, рускія, палякі, літоўцы, яўрэі*** і іншыя народы. Усіх іх



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

аб’ядноўвае наша беларуская зямля. Жыхары нашай краіны працавіты і таленавіты. Гэта яны будуюць гарады і дарогі, ствараюць машыны, пішуць кнігі, лятаюць у космас.

У гады Вялікай Айчыннай вайны нашы людзі праявілі мужнасць і сапраўдны **гераізм**. Мы памятаем імёны герояў-беларусаў. Гэта лётчык ***Аляксандр Гаравец***, партызан ***Канстанцін Заслонаў***, піянер ***Марат Казей***.

Першыя друкаваныя кнігі з’явіліся на нашай зямлі дзякуючы беларусу ***Францыску Скарыну***. Яго імем названа адна з вуліц у сталіцы нашай Радзімы — у горадзе Мінску.

Далёка за межамі нашай краіны ведаюць творчасць народных паэтаў Беларусі ***Якуба Коласа*** і ***Янкі Купалы***.



Якуб Колас



Янка Купала



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Пётр
Клімук



Уладзімір
Кавалёнак



Алег
Навіцкі

Усяму свету вядомы беларускія лётчыкі-касманаўты ***Пётр Клімук***, ***Уладзімір Кавалёнак***, ***Алег Навіцкі***.

Беларускія спартсмены перамагаюць на міжнародных спаборніцтвах. Сярод іх барэц ***Аляксандр Мядзведзь***, біятланістка ***Дар'я Домрачава***.

У нашай краіне і за яе межамі дарослыя і дзеці спяваюць песні беларускага кампазітара ***Ігара Лучанка***. Усяму свету вядома імя мастака ***Марка Шагала***, **які** нарадзіўся ў Віцебску.

Людзі Беларусі добрыя, гасцінныя, мужныя, прыгожыя. Іх прыгажосць не толькі знешняя. Яна ў іх добрых справах, учынках, узаемаадносінах. Беларусы ведаюць і любяць сваю родную мову — ***беларускую***. Ведаюць народныя казкі, прыказкі,



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

прымаўкі, песні, танцы. Яны ведаюць і адзначаюць народныя і дзяржаўныя святы нашай краіны.

Беларусы ведаюць і паважаюць мовы, песні, танцы іншых народаў, вывучаюць іх. Ведаць лепш за ўсё трэба тое, што звязана з тваім народам. Напрыклад, на беларускай мове гаварылі нашы ***прадзядулі*** і ***прабабулі***. Гэтую мову трэба ведаць, каб памятаць пра сваіх **продкаў**, ведаць, як яны жылі.

Каб вывучыць мову, трэба чуць яе, гаварыць на ёй. Дзеці вывучаюць беларускую мову ў дзіцячых садах, школах. На радыё, тэлебачанні ёсць перадачы на беларускай мове. Пісьменнікі Беларусі пішуць на роднай мове свае кнігі. У тэатрах ставяць спектаклі на беларускай мове. Напісана шмат выдатных беларускіх вершаў, песень.

? 1. Назавіце знакамітых людзей Беларусі. Чаму яны сталі знакамітымі? Адкажыце з дапамогай адпаведных малюнкаў.

2. Хто з беларусаў здзейсніў палёты ў космас?

3. Кнігі якіх беларускіх аўтараў вы чытаеце? Якія беларускія песні ведаеце?

4. Што вы ведаеце пра людзей, у гонар якіх у вашым горадзе (у сяле, вёсцы) названы вуліцы або пастаўлены помнікі?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

5. Якія тэлевізійныя перадачы на беларускай мове вы глядзіце?

6. Назавіце беларускія прыказкі і прымаўкі.

**Гераі́зм, про́дкі.**

Прыміце ўдзел у ***конкурсе знаўцаў*** беларускіх вершаў, песень. Вывучыце некалькі беларускіх прыказак, прымавак.

## Паўторым галоўнае пра нашу Радзіму

Краіна, у якой мы жывём, называецца Рэспубліка Беларусь. Гэта наша Радзіма. Радзімай мы называем яе таму, што мы тут нарадзіліся. Тут жывуць нашы бацькі і родзічы. Усё тут для нас роднае.

Сталіца Беларусі — горад-герой Мінск. Тут працуе наш урад. У Мінску жыве каля двух мільёнаў чалавек. Тут шмат вуліц, праспектаў, плошчаў, прыгожых будынкаў. У Мінску шмат заводаў і фабрык. На вуліцах горада шмат транспарту, пешаходаў. У Мінску ёсць і падземны транспарт — метро.

Наша краіна мае свае дзяржаўныя сімвалы: сцяг, герб, гімн. Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь афарбаваны ў чырвоны і зялёны колеры. Злева на сцягу намаляваны арнамент.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Акрамя Мінска буйнымі гарадамі нашай краіны з'яўляюцца Брэст, Гомель, Віцебск, Гродна, Магілёў. Кожны з іх мае свае ***славутасці*** і памятныя месцы.

У Беларусі жывуць працавітыя, таленавітыя людзі. Яны любяць сваю Радзіму, сваю родную мову. Далёка за межамі нашай краіны вядомы імёны знакамітых людзей: пісьменнікаў, навукоўцаў, мастакоў, музыкантаў, касманаўтаў, спартсменаў.

### Праверым сябе

1. Назавіце краіну, у якой вы жывяце. Які горад з’яўляецца яе сталіцай?
2. Чаму Рэспубліку Беларусь мы называем сваёй Радзімай?
3. Пакажыце на малюнках дзяржаўныя сімвалы нашай краіны. Назавіце іх.
4. Назавіце буйныя гарады Беларусі. Які з іх знаходзіцца недалёка ад месца, дзе вы жывяце?
5. Якія тавары вырабляюць у буйных гарадах нашай краіны?
6. Чым славіцца горад, у якім вы жывяце або які знаходзіцца недалёка?
7. Якіх славутых людзей нашай краіны вы ведаеце? Што вы пра іх ведаеце?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ПРАДМЕТЫ ВАКОЛ МЯНЕ

## 27. Разнастайнасць адзення

Прачытайце радкі слоў. У якім з іх названы толькі прадметы адзення? Прывядзіце свае прыклады прадметаў адзення.

Сукенка, боты, штаны, кофта, шуба, майка, чаравікі.

Сарафан, пінжак, спадніца, куртка, халат, кашуля, кофта.

Людзі прыдумалі і стварылі розныя прадметы адзення. Яна ахоўвае цела чалавека ад спякоты і холаду, ад бруду і пашкоджанняў.

Адзенне шыюць з розных тканін. Яны бываюць рознага колеру, рознай таўшчыні. Назвы тканін таксама розныя. Ёсць ***драп***, ***паркаль***, ***шоўк*** і інш. Адны тканіны вырабляюць з раслін, напрыклад з лёну. Гэта ***льняныя*** тканіны. Іншыя атрымліваюць з воўны свойскіх жывёл, напрыклад авечак. Гэта ***ваўняныя*** тканіны. Кожная тканіна мае свае ўласцівасці. Пры пашыве адзення людзі ўлічваюць ўласцівасці тканін. Напрыклад, з тоўстых ваўняных тканін шыюць паліто і іншыя цёплыя рэчы. З тонкіх тканін шыюць лёгкія сукенкі, касцюмы.

Адзенне бывае паўсядзённым і святочным. Асобнае адзенне павінна быць для дома, заняткаў



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

спортам, работы. Ёсць адзенне, якое носяць толькі летам або толькі зімой. Адзенне для восені і вясны называюць **дэмісезонным**. Ёсць мужчынскае, жаночае, дзіцячае адзенне. Бывае ніжняе і верхняе адзенне. Адзенне шыюць на швейных фабрыках. Пашыць прадметы адзення можна ў швейных **атэлье** або майстэрнях. Прадметы адзення — гэта асабістыя рэчы чалавека. Іх падбіраюць па памерах і па колеры. Пры выбары фасону адзення трэба ўлічваць асаблівасці фігуры, узрост чалавека, які яе носіць. Адзенне павінна ўпрыгожваць чалавека, пасаваць яму. Яна павінна быць **практычнай**, зручнай.





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Па знешнім выглядзе чалавека можна вызначыць, акуратны ён або неахайны. Акуратны чалавек заўсёды знаходзіць час, каб прывесці сябе ў парадак. Адзенне пэцкаецца, мнецца, часам рвецца. Таму яго трэба пастаянна даглядаць, рамантаваць.

Дома пасля школы абавязкова трэба пераапранацца. Насоўку, шкарпэткі, ніжнюю бялізну неабходна мяняць кожны дзень. Памыць іх можна **ўручную**. Для гэтага трэба замачыць выраб у цёплай вадзе з пральным парашком або з мылам. Потым старанна памыць, звярнуўшы ўвагу на забруджаныя месцы. Пасля прапаласкаць некалькі разоў у чыстай вадзе і адціснуць. Пасля гэтага трэба развесіць для прасушкі. Высахлую рэч трэба акуратна скласці.

1. Раскажыце, якое бывае адзенне. Якое адзенне ёсць у вас? Адкажыце з дапамогай малюнка і схемы.

Адзенне
- паўсядзённае
- працоўнае
- святочнае
- дамашняе
- спартовае

Адзенне
- летняе
- зімовае
- дэмісезоннае (для восені і вясны)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Якое адзенне вам падабаецца? Якога колеру? Якога фасону?

3. Як падабраць адзенне ў магазіне? Ці ведаеце вы памеры свайго адзення? Назавіце іх.

4. Як вы апранецеся ў дажджлівае надвор'е восенню? Як апранецеся летам у спёку?

5. Назавіце рэчы, якія вы надзенеце зімой для катання на санках.

6. Чым адрозніваецца акуратны чалавек ад неахайнага?

**Дэмісезóнны, ательé, практы́чны, уручнýю.**

### Догляд адзення (практычная работа)

1. Агледзьце сваё адзенне. Ацаніце яго стан. Пры неабходнасці выканайце нескладаныя дзеянні па рамонце адзення, пачысціце яго шчоткай. Павесьце на вешалку або складзіце ў шафу. Прыбярыце на месца прадметы для догляду адзення.

2. Разам з дарослымі папрацуйце з узорамі тканін. Для гэтага вазьміце ласкуткі тканін. Вызначце, якога яны колеру. Якая іх таўшчыня? Якія яны навобмацак? Што з іх можна пашыць?

У школе неабходна заўсёды выглядаць ахайным. Для гэтага штодзень з вечара рыхтуйце школьнае адзенне і абутак на заўтрашні дзень. Агледзьце адзенне і абутак. Вызначце



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ступень іх забруджвання. Калі трэба, пачысціце, прасушыце прадметы адзення і абутак. Акуратна павесьце адзенне на вешалку. З вечара паклапаціцеся пра наяўнасць расчоскі, пра чысціню насоўкі.

Дашу ў класе ўсе паважаюць. Яна — самая акуратная вучаніца. У школу яе прыводзіць бабуля. Аднойчы Даша прыйшла ў клас адна, без бабулі. Дзяўчынка была непрычасаная, няўмытая. Аказалася, што бабуля захварэла...

## 28. Разнастайнасць абутку

Прачытайце радкі слоў. У якім з іх названы толькі абутак? Дапоўніце радок сваімі прыкладамі.

Сукенка, боты, штаны, кофта, шуба, майка, туфлі.
Чаравікі, красоўкі, боты, тапкі, басаножкі.

Людзі стварылі розны абутак: для зімы і лета, для сухога і дажджлівага надвор'я. Абутак засцерагае нашы ногі ад холаду, бруду, драпін і ранак. Абутак вырабляюць з розных матэрыялаў: са скуры, гумы, тканіны, **лямцу**. Скура — **натуральны** матэрыял, а гума — **штучны**. Скураны абутак чысцяць абутковым крэмам. Крэм выбіраюць адпаведна з колерам абутку. Гума не прапускае ваду



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

і паветра. У гарачае і марознае надвор’е шкодна хадзіць у гумовым абутку. Гумовы абутак мыюць вадой.

Абутак, як і адзенне, бывае паўсядзённым і святочным. Падбіраюць абутак адпаведна з відам заняткаў. Напрыклад, для спорту патрэбны ***красоўкі*** або кеды. Дома надзяваюць дамашнія тапкі. Бывае мужчынскі, жаночы, дзіцячы абутак. Яго, як і адзенне, падбіраюць па памерах, колеры, сезоне. Пры выбары фасону трэба ўлічваць асаблівасці **ступні**, узрост чалавека. Летам носяць лёгкі адкрыты абутак са скуры, тканіны. Для дажджлівага надвор’я выбіраюць закрыты абутак з непрамакальнага матэрыялу. Такім матэрыялам з’яўляецца гума. Зімой адзяваюць уцеплены **абутак на футры**.





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

За станам абутку неабходна пастаянна сачыць. Каб абутак больш доўга служыў, яму патрабуецца пастаянны догляд. Акуратны чалавек заўсёды знаходзіць час, каб прывесці свой абутак у парадак. Пры нашэнні абутку трэба ўлічваць пору года і надвор'е.

**Памятайце!** Скураны абутак прамакае. У сырое надвор'е яго верх трэба апрацаваць спецыяльнымі **ахоўнымі сродкамі**. Іх можна набыць там жа, дзе купляеце абутак. Мокры абутак нельга сушыць на награвальных прыборах, каля агню або на сонцы. Сушыць абутак трэба пры пакаёвай тэмпературы, набіўшы папераў.

Правільна здымайце абутак з нагі, не наступаючы на **заднік**. Для догляду за абуткам карыстайцеся спецыяльнымі абутковымі крэмамі і шчоткамі.






Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Пры неабходнасці здавайце абутак у рамонтную майстэрню. Дома пасля школы трэба абавязкова пераабувацца.

1. Разгледзьце малюнак на с. 106. Прачытайце схемы. Раскажыце, які бывае абутак.

Абутак
- паўсядзённы
- рабочы
- святочны
- дамашні
- спартыўны

Абутак
- са скуры
- з гумы
- з тканіны
- з лямцу

2. Раскажыце, які абутак вам падабаецца. Які абутак ёсць у вас? Абутак якога памеру вы носіце?

3. Які абутак вы надзенеце для заняткаў фізкультурай? Які абутак трэба выбіраць у дажджлівае надвор’е?

4. Назавіце абутак, які носяць зімой. Адкажыце з дапамогай малюнка на с. 106.

**Ля́мец, натура́льны, шту́чны, ступня́, абу́так на фу́тры, ахо́ўны сро́дак, за́днік.**

Агледзьце абутак. Вызначце, з якога матэрыялу ён выраблены. Мяккай сурвэткай ачысціце ад гразі паверхню абутку. Выберыце крэм і шчотку



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

для чысткі абутку. Пачысціце свой абутак крэмам. Для гэтага выцісніце невялікую колькасць крэму з цюбіка на шчотку. Надзеньце абутак на руку. Шчоткай нанясіце крэм на абутак. Пакіньце на некалькі хвілін, каб абутак увабраў крэм. ***Адпаліруйце*** абутак мяккай анучкай. Прыбярыце рабочае месца. Вымыйце рукі з мылам. **Памятайце!** Ад абутковага крэму трэба засцерагаць рукі і адзенне. Абутковы крэм не трэба наносіць на ўстаўкі з тканін і іншых матэрыялаў.

Пры куплі абутку неабходна выконваць некаторыя правілы. Вызначце, які абутак вам неабходны (па прызначэнні, сезоннасці, фасоне). Падбярыце абутак па памеры нагі. Спытайце ў прадаўца дазволу прымерыць. Надзявайце абутак з дапамогай спецыяльнай лыжачкі або ***абутковага ражка.***

**Памятайце!** Пры прымерцы абутак павінен быць зручным. Ён не павінен сціскаць ступню. Абутак для школьнікаў павінен мець невысокі абцас. Пры нашэнні абутку без абцаса можа развіцца ***плоскаступнёвасць.***

Прыйшоў Віталік да Мішы ў госці. Куртку і шапку павесіў на вешалку. Боты зняў і акуратна паставіў каля парога. Прычасаў валасы перад люстэркам. Павітаўся з Мішавай бабуляй. І пайшоў



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

у дзіцячы пакой гуляць. Бабуля сказала: «Вось які хлопчык акуратны і ветлівы. Хто акуратны, той людзям прыемны».

## 29. Бытавыя прыборы

Прачытайце загадку. Отгадайте. Растлумачце, як загадка падказала вам отгадку.

Ходит-бродит по коврам, водит носом по углам.
Где прошёл, там пыли нет. Пыль и сор — его обед.

Чалавек прыдумаў і стварыў **бытавыя прыборы,** якія робяць наша жыццё больш зручным, **камфортным.** Гэта прас, ***мікрахвалевая печ***, халадзільнік, пыласос, пральная і пасудамыйная машыны. З дапамогай бытавых прыбораў хатнюю работу можна выканаць хутка, лёгка і якасна. Каб пагладзіць





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

бялізну, выкарыстоўваюць прас. Для выдалення пылу з дываноў, мяккай мэблі бяруць пыласос. Халадзільнік, маразільнік патрэбны для захоўвання прадуктаў, якія хутка псуюцца: мяса, рыбы, малака.

Працуюць бытавыя прыборы пры дапамозе **электрычнасці**. Электрычны ток выпрацоўваецца на **электрастанцыях** і паступае ў дамы па правадах. Дрэнна чалавеку, калі падача электрычнасці спыняецца. Не загараюцца лямпачкі, не ўключаецца тэлевізар. Усе бытавыя электрапрыборы перастаюць працаваць.

Электрычны ток — нябачны працаўнік. Але ён яшчэ нябачная небяспека. Таму абыходзіцца з бытавымі электрапрыборамі трэба асцярожна. Яны могуць быць ***смяротна небяспечнымі***. Трэба пастаянна сачыць за іх спраўнасцю. Няспраўны бытавы прыбор дыміць. Няспраўнасць прыбора можна выявіць па асаблівым паху: пахне гарэлым. Нельга чапаць, уключаць і выключаць бытавыя электрапрыборы мокрымі рукамі. Нельга цягнуць за шнур, які злучае прыбор з электрычнай **разеткай**. Няспраўны электрапрыбор можа прывесці да пажару.

**Памятайце!** Калі вы ўбачылі, што бытавы прыбор задыміўся, неадкладна паведаміце пра гэта дарослым. Неабходна хутка выняць вілку з разеткі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Калі нешта загарэлася, трэба паспрабаваць хутка патушыць полымя. Калі агонь разгараецца, трэба выклікаць пажарных. Для гэтага трэба набраць на тэлефоне нумар ***101***, назваць свой адрас, імя, прозвішча. Неабходна расказаць, што здарылася. Потым трэба выбегчы з кватэры і паклікаць на дапамогу.

1. Разгледзьце малюнак на с. 110. Якія бытавыя прыборы на ім намаляваны? Якія з іх ёсць у вас дома? Для чаго яны патрэбны?

2. Чаму электрапрыборы могуць быць небяспечнымі?

3. Што трэба рабіць у выпадку задымлення электрапрыбора?

4. Раскажыце, што трэба рабіць у выпадку пажару.

**Бытавы́ прыбо́р, камфо́ртны, электры́чнасць, электраста́нцыя, разе́тка.**

Электрычнасць дома і ў школе трэба эканоміць. Для гэтага звяртайце ўвагу, ці не гарыць дарма лямпачка. Правярайце, ці не ўключаны без патрэбы электрапрыборы. Выключайце іх самі ці звяртайцеся па дапамогу да дарослых.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Людзі навучыліся ствараць электрычнасць у батарэйках. Таму некаторыя прыборы працуюць на батарэйках.

## 30. Кожнай рэчы — сваё месца

Прачытайце радкі слоў. У якім з іх названы прадметы, а ў якім — месцы, дзе яны павінны знаходзіцца? Раскажыце, куды варта пакласці (паставіць, павесіць) рэчы, названыя ў другім радку.

Кніжная паліца, кухонная шафа, шафа для адзення, паліца для абутку, скрыня для інструментаў, акно, дамашняя аптэчка, вешалка ў калідоры.

Таблеткі, кніга, сукенка, шапка, чаравікі, каструля, малаток, штора.

У кожнага чалавека ёсць дом або кватэра, дзе ён жыве. Утульнасць у кватэры залежыць ад таго, як чалавек клапоціцца пра яе. Утульнае жыллё паляпшае настрой, выклікае пачуццё спакою, захоўвае здароўе. Кожны пакой у кватэры ці хаце мае свой набор прадметаў. Іх падбіраюць не выпадкова, а па іх прызначэнні.

Напрыклад, у спальні павінны стаяць ложкі, тумба або шафа для бялізны. Прадметы ў пакоях падбіраюцца па спалучэнні колераў. Расстаўляюць прадметы так, каб было зручна імі карыстацца. Лішніх, выпадковых рэчаў у пакоях быць не



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



павінна. Каб стварыць утульнасць у пакоі (у кватэры, доме), на вокны вешаюць ***шторы***. На столі ўмацоўваюць ***люстру*** або ***свяцільнік***. Сцяну ўпрыгожваюць ***карцінай***. На падлогу кладуць ***дыван***. ***Шпалеры***, шторы, ***пакрывалы*** падбіраюць так, каб іх колеры і малюнкі спалучаліся. Утульнасць у доме надаюць пакаёвыя расліны.

! Чысціня і парадак у доме — клопат кожнага члена сям'і. Кожная рэч павінна быць на сваім месцы. У доме не павінна быць пылу, смецця. Пакоі варта часцей праветрываць. Рэгулярна належыць рабіць вільготную ўборку. Па меры неабходнасці трэба



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

праводзіць **генеральную ўборку**. Пры гэтым варта наводзіць парадак у шафах, скрынях. Трэба выціраць пыл са сцен, столі. Неабходна мыць вокны, люстры. Звычайна ў такой працы ўдзельнічае ўся сям’я.

1. Што ў вашым разуменні азначае ўтульная кватэра? Адкажыце з дапамогай малюнка.

2. Ці зменіцца знешні выгляд кватэры пасля генеральнай уборкі? Як?

3. Уявіце, што да вас у госці прыйшоў сябар. Пакажыце яму сваю кватэру (сваю хату). Раскажыце пра кожны пакой па плане.

Як называецца? Для чаго ён служыць? Якія прадметы ў ім знаходзяцца? Для чаго яны патрэбны?

**Генера́льная ўбо́рка.**

Прыміце ўдзел у генеральнай уборцы свайго класа.

Дапамагайце дарослым падтрымліваць чысціню і ствараць утульнасць у доме. Рэгулярна рабіце парадак у сваіх рэчах. Удзельнічайце ў генеральнай уборцы сваёй кватэры (сваёй хаты).

Прыйшла мама з працы і рукамі пляснула. Веласіпед зламаны. Кашуля падраная. Боты



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

мокрыя валяюцца ў калідоры. На пытанне мамы, як гэта ўсё адбылося, сын адказаў, што ён не вінаваты. Рэчы самі зламаліся, разарваліся, намачыліся. Мама сказала, што на прагулку сын не пойдзе да таго часу, пакуль рэчы самі не адрамантуюцца, не зашыюцца, не высушацца. Ці можа такое адбыцца?

## Паўторым галоўнае пра рэчы навокал

Вакол нас шмат неабходных рэчаў. Гэта адзенне, абутак, мэбля, посуд, бытавыя прыборы.

Людзі стварылі living рознае адзенне і абутак: паўсядзённыя і святочныя, для зімы і лета, для сухога і дажджлівага надвор'я. Бывае мужчынскае, жаночае, дзіцячае адзенне і абутак. Прадметы адзення і абутак — гэта асабістыя рэчы чалавека. Іх падбіраюць па памеры, колеры, сезоне, матэрыяле. Пры выбары фасону адзення і абутку ўлічваюць асаблівасці фігуры, ступні, узрост чалавека.

Адзеннем і абутак неабходна пастаянна даглядаць. Акуратны чалавек заўсёды знаходзіць час, каб прывесці сваё адзенне і абутак у парадак. На працягу сутак адзенне і абутак некалькі разоў мяняюць. Дома пасля школы трэба абавязкова пераапранацца і пераабувацца. Адзенне і абутак пэцкаюцца, часам рвуцца. Пры неабходнасці іх трэба рамантаваць.

Чалавек прыдумаў і стварыў нямала бытавых электрапрыбораў, якія робяць наша жыццё больш



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

зручным, камфортным. Пры іх дапамозе хатнюю працу можна выканаць хутка і якасна.

Абыходзіцца з бытавымі электрапрыборамі трэба асцярожна. Яны могуць быць смяротна небяспечнымі, таму што працуюць пры дапамозе электрычнага току. Трэба пастаянна сачыць за спраўнасцю бытавых прыбораў. Няспраўны электрапрыбор можа прывесці да пажару.

У кожнага чалавека ёсць хата або кватэра, дзе ён жыве. Тут абавязкова павінны быць чысціня і парадак. Кожны пакой у кватэры ці хаце мае свой набор прадметаў. Іх падбіраюць не выпадкова, а па іх прызначэнні. Расстаўляюць прадметы так, каб было зручна імі карыстацца. Кожная рэч павінна быць на сваім месцы. У доме не павінна быць пылу, смецця. Пакой варта часцей праветрываць. Рэгулярна трэба рабіць вільготную ўборку.

## Праверым сябе

1. Прывядзіце прыклады адзення (абутку, бытавых прыбораў).

2. Прачытайце назвы прадметаў адзення і абутку. Якое адзенне і абутак трэба выбраць для паходу ў тэатр?

Спартыўны касцюм, джынсы і світар, святочны касцюм або сукенка, карнавальны касцюм, кеды.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

3. Прачытайце назвы рэчаў. На якія дзве групы можна падзяліць рэчы? Назавіце кожную групу. Дапоўніце групу адзення (абутку) сваімі прыкладамі.

Паліто, боты, сукенка, красоўкі, майка, штаны, чаравікі, пінжак.

4. Ці ўмееце вы прыбіраць рэчы на месца пасля карыстання імі? Ці чысціце вы самі свой абутак (адзенне)? Ці ўмееце захоўваць чысціню і парадак вакол сябе?

5. Раскажыце, што трэба зрабіць у наступных сітуацыях.

Вы з'елі цукерку і хочаце выкінуць абгортку. Вы кінулі паперку ў скрыню, але прамахнуліся.

Вы выйшлі з транспарту і не ведаеце, куды падзець выкарыстаны талон.

Вы хочаце купіць адзенне (абутак) у магазіне. Як будзеце выбіраць?

6. Чаму бытавыя электрапрыборы могуць быць небяспечнымі? Што трэба рабіць, каб паменшыць іх небяспечнасць?

7. Прачытайце словазлучэнні ў кожным слупку. Што трэба для таго, каб прывесці рэчы ў парадак?

| | |
|---|---|
| Брудныя чаравікі | Шчотка для адзення |
| Нясвежая кашуля | Шчотка для абутку |
| Запэцканае паліто | Пральны парашок |



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ПРЫРОДА І ЧАЛАВЕК

## ПОРЫ ГОДА (ПРАЦЯГ)

### 31. Расліны і жывёлы зімой

Раскажыце пра зімовы ўбор раслін. Пры адказе карыстайцеся сваімі назіраннямі ў прыродзе. Як дапамагчы раслінам і жывёлам перажыць халады?

Зімой уся зямля пакрыта снегам. Пад снегам зімуюць многія травяністыя расліны. Снежныя шапкі ляжаць зімой на галінах дрэў і кустоў. Таму іх цяжка адрозніць адно ад аднаго. Дрэвы і кусты адрозніваюць зімой па колеры кары, па галінах. З ліставых дрэў лягчэй за ўсё пазнаць зімой бярозу. Яе белую кару з чорнымі лапінамі відаць здалёк. Галіны бярозы зімой голыя, без лісця. Няцяжка пазнаць зімой елку і сасну. Гэтыя дрэвы і зімой застаюцца зялёнымі. Таму елку і сасну называюць **вечназялёнымі** дрэвамі.

Зіма для дзікіх жывёл — цяжкі час. Для звяроў і птушак галоўнае — сытасць. Хто сыты, таму холад не страшны. Бо добры абед знутры грэе. Калі б для



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

дзікіх жывёл ежы было ўволю, не страшная была б зіма. Але пуста ў лесе, голадна. Цяжка здабываць корм зімой дзікім звярам і птушкам. Амаль увесь час яны праводзяць у пошуках корму. Людзі дапамагаюць ім перажыць галодны час. У лесе ладзяць кармушкі для дзікіх птушак і звяроў.



Пра свойскіх жывёл зімой клапоцяцца людзі. Яны трымаюць іх у хлявах, на фермах. Кормяць іх, пояць, сочаць за чысцінёй памяшканняў.

1. Якое дрэва ў зімовым уборы вы лічыце самым прыгожым? Чаму?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Як зімой можна пазнаць бярозу? Елку? Адкажыце з дапамогай малюнка.

3. Чаму дзікім жывёлам цяжка зімой?

4. Як людзі могуць дапамагчы дзікім жывёлам зімой?

5. Як людзі даглядаюць свойскіх жывёл?

**Вечназялёны, сы́тасць.**

## Зімовая экскурсія ў прыроду

1. Якое цяпер надвор'е? Якое неба? Як свеціць сонца? Ці ёсць вецер?

2. Па якіх прыкметах мы пазнаём зіму?

3. Раскажыце пра свае назіранні ў прыродзе зімой.

4. Знайдзіце і пакажыце ліставыя дрэвы, з якімі вы пазнаёміліся восенню. Па якіх прыкметах вы іх распазналі зімой? Як змяніўся іх знешні выгляд? Агледзьце іх галіны. Знайдзіце і пакажыце пупышкі.

5. Знайдзіце і пакажыце хваёвыя дрэвы. Па якіх прыкметах вы іх распазналі? Як змяніўся іх знешні выгляд у параўнанні з восенню?

6. Праверце, ці можаце вы вызначыць па іголцы і шышках, якое хваёвае дрэва перад вамі.

7. Якіх жывёл можна назіраць у прыродзе зімой? Пашукайце на снезе іх сляды. Вызначце, чые яны.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

8. Прыслухайцеся да зімовых гукаў у прыродзе. Што ўдалося пачуць?

9. Звярніце ўвагу на зімовую прыроду. Чым яна прыгожая? Раскажыце, што вам спадабалася.

10. Не забывайце правілы паводзін на прыродзе. Пра што вам нагадваюць малюнкі?





11. Адшукайце ў прыродзе прыкметы зімы. Як пазнаць зімой бярозу? Елку? Сасну? Якую расліну ў зімовым уборы вы лічыце самым прыгожай? Чаму?

12. Пасля снегападу зямля ў полі, у лесе падобна на гладкія старонкі кнігі. Выпадзе снег — гэтыя старонкі чыстыя. Праз некаторы час на іх з'яўляецца шмат нейкіх знакаў, рысак, кропак. Хто намаляваў іх? Ці можна іх прачытаць?

У зімы ёсць тры сыны. Яны падобныя, але ўсё ж зусім розныя. Як вы думаеце, пра якіх братоў ідзе гаворка?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Дзік Сарока Воўк Лось

Малодшы з іх год завяршае. Па яго камандзе трашчаць маразы, рыпае снег пад нагамі. Ён малюе на вокнах узоры.

Сярэдні брат пачынае новы год. Ён можа адмарозіць вушы, нос, шчокі. У паветры кружыць сухія калючыя сняжынкі.

Старэйшы брат любіць завеі, завірухі. Моцныя маразы пасылае ўночы. Удзень пачынае прыпякаць сонца. На сонечным баку снег падтае.

## Паўторым галоўнае пра зіму

Зімовыя месяцы — снежань, студзень, люты. Сонца зімой свеціць няярка. Дзень кароткі, ноч доўгая. Сонечныя промні слаба грэюць. Снег пакрывае зямлю, дахі дамоў. Ён ляжыць на галінах дрэў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Ліставыя дрэвы і кусты стаяць голыя. Зялёнымі ў гэтую пару года застаюцца толькі елкі і сосны.

Зімуюць у нашым краі вераб'і, вароны, сініцы. Для іх людзі развешваюць кармушкі. Цяжка дзікім звярам знайсці зімой корм. Таму людзі падкормліваюць іх. Людзі даглядаюць свойскіх жывёл. У іх зімой з'яўляюцца дзіцяняты. Зімой людзі прыбіраюць снег, рыхтуюцца да веснавой працы.

Для здароўя карысна катацца на санках, лыжах, каньках. Заняткі на свежым паветры загартоўваюць чалавека. Зімой лёгка застудзіцца. Для здароўя чалавека шкодна пераахаладжванне. У марознае надвор'е можна абмарозіць твар, пальцы ног, рук.

### Праверым сябе

1. Прачытайце радкі з верша. Якая пара года апісана ў іх?

По двору метелица
Ковром шелковым стелется,
Но больно холодна.
Воробышки игривые,
Как детки сиротливые,
Прижались у окна.

*С. Есенин*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**2. Растлумачце значэнне прыказкі.**

Мороз не велик, да стоять не велит.

**3. Адгадайце, пра якую прыкмету зімы ідзе гаворка ў загадцы. Растлумачце, як здагадаліся.**

Кручу, верчу, знать никого не хочу.

**4. Раскажыце пра працягласць зімовага дня і зімовай ночы. Што з іх больш кароткае, а што — больш доўгае?**

**5. Прачытайце апісанне прыкмет сезонных зменаў у прыродзе. Якія з іх адносяцца да зімовых?**

Сонца добра грэе зямлю. Сонечныя промні мала грэюць зямлю.

Дзень кароткі. Ноч доўгая. Дзень доўгі. Ноч кароткая.

Холадна. Цёпла. Горача. Марозна.

Халодная імжа. Галалёд. Цёплы дождж. Дождж з градам. Туман. Шэрань. Навальніца. Вясёлка. Снегапад.

Шмат корму для ўсіх жывёл. Мала корму для ўсіх жывёл. Няма корму для пералётных птушак.

Прырода квітнее. Прырода адпачывае. Прырода вяне.

**6. Раскажыце пра зімовае надвор'е. Правільна выберыце словы з дужак.**

Надвор'е зімой больш *(цёплае, халоднае)*, чым восенню. Зімой *(рэдка, часта)* ідзе *(снег, дождж)*.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## 32. Вясна. Ахова здароўя вясной

Прачытайце і абмяркуйце сітуацыю. Ці назіралі вы ў прыродзе падобныя з'явы?

Дзьме цёплы вецер. Гурбы чарнеюць, асядаюць. Апоўдні з дахаў цячэ. Вечарам утвараюцца ледзяшы.

Па календары вясна пачынаецца 1 сакавіка. Яна працягваецца тры месяцы: ***сакавік, красавік, май*** (малюнак на першым форзацы). Вясной сонца падымаецца ўсё вышэй над зямлёй. Сонечнага святла так многа, што яно слепіць вочы. Сонца аддае зямлі шмат цяпла. Снег растае. З'яўляюцца **праталіны.** Гэта самая заўважная прыкмета надыходу вясны. Спачатку снег растае каля дрэў, будынкаў, потым — на палях. Пазней ён растае ў лесе. Ручаі сцякаюць у рэкі, сажалкі, азёры.

Вясной ідуць дажджы. Часам ідзе снег, але ён хутка растае. Ад вясновага цяпла цямнее і трэскаецца лёд на рэках і азёрах. Крыгі паступова растаюць. Ад расталага лёду і снегу рэкі перапаўняюцца вадой. Яны выходзяць з берагоў і заліваюць вялікія тэрыторыі. Такая з'ява называецца **паводкай.**

Вясной людзі прыводзяць у парадак двары, вуліцы, паркі, скверы. Пачынаецца вясновая праца на агародах, палях, у садах. У гэтую пару года людзі спяшаюцца за кароткі час пасеяць насенне.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Варта зацягнуць вясновую працу — і глеба перасохне. Насенне будзе прарастаць нядружна ці ўвогуле не прарасце.

Ад таго, як будзе праведзена **сяўба**, шмат у чым залежыць ураджай. Нездарма кажуць: вясновы дзень год корміць. Школьнікі дапамагаюць дарослым выконваць вясновую працу ў прыродзе. Вясной людзі даглядаюць дрэвы і кустоўе саду. Высаджваюць расаду агароднінных раслін, кветак.

! Вясной трэба быць уважлівым да свайго здароўя. Трэба працягваць загартоўку. Неабходна больш бываць на свежым паветры. Вопратку і абутак варта падбіраць па надвор'і. У дажджлівае надвор'е трэба карыстацца парасонам. Нельга быць на прагулцы у мокрым адзенні і абутку.

**Памятайце!** Лёд на вясновых вадаёмах нетрывалы. У любы момант нават пад невялікім цяжарам лёд можа раскалоцца. Выходзіць на вясновы лёд вельмі небяспечна!

? 1. Раскажыце пра прыкметы вясны. Карыстайцеся малюнкамі на першым форзацы.

2. Чаму вясной становіцца цяплей, чым зімой?

3. Чаму рэкі і азёры вясной выходзяць з берагоў?

4. Чаму вясной нельга выходзіць на лёд вадаёмаў?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

5. Якую працу ў прыродзе выконваюць людзі вясной? У якой працы вы прымалі ўдзел?

6. Раскажыце пра правілы аховы здароўя вясной.

**Прата́ліна, льдзі́на, паво́дка, сяўба́.**

Разгледзьце малюнкі на першым форзацы. Якія прыкметы вясны паказаны? Што з таго, што намалявана, вы ўжо назіралі ў прыродзе?

## Вясновая экскурсія ў прыроду

1. Якое зараз надвор'е? Якое неба? Як свеціць сонца? Які стаў снег?

2. Па якіх прыкметах мы пазнаём вясну?

3. Раскажыце пра свае назіранні вясной.

4. Знайдзіце і пакажыце расліны, знаёмыя вам па ранейшых экскурсіях. Якія змены адбыліся ў іх жыцці?

5. Разгледзьце пупышкі на ліставых дрэвах. Што з імі адбылося? Вызначце, якія расліны ўжо расцвілі.

6. Якія жывёлы вам сустрэліся? Што змянілася ў паводзінах жывёл з надыходам вясны? Чым заняты пералётныя птушкі?

7. Прыслухайцеся да вясновых гукаў у прыродзе. Што ўдалося пачуць?

8. Паназірайце за працай людзей у прыродзе. Прыміце ўдзел у пасільнай працы (па магчымасці).



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

9. Звярніце ўвагу на вясновую прыроду. Чым яна прыгожая? Раскажыце, што вам спадабалася.

10. Не забывайце выконваць правілы паводзін на прыродзе. Пра якія з іх вам нагадваюць малюнкі?





У горадзе ёсць вялікая сажалка. На сажалцы жывуць дзікія качкі. Людзі прыходзяць на бераг сажалкі. Яны кормяць качак. Птушкі прывыклі да людзей і падплываюць да іх зусім блізка. На сярэдзіне сажалкі ёсць невялікі ***астравок***. Людзі пабудавалі на ім будкі-домікі. Там качкі ўдзень хаваюцца ад ветру, а ўначы спяць.

## 33. Расліны вясной

Раскажыце, як змянілася надвор’е вясной. Што змянілася ў жыцці раслін з надыходам вясны? Пры адказе карыстайцеся сваімі назіраннямі падчас экскурсіі на прыроду.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Вясной сонца свеціць больш ярка і грэе больш моцна, чым зімой. Пад цёплымі промнямі вясновага сонца глеба **адтае** і адаграецца. Ад расталага снегу ў ёй назапашваецца шмат ***вільгаці***.

Сонечнае святло, цяпло і вільгаць вельмі патрэбны раслінам. Таму з надыходам вясны ў раслін пачынаецца рух сокаў. Ажывае кожнае дрэва, кожны куст, кожная травінка.

З'яўляюцца вясновыя **першацветы**: ***пралеска, медуніца, ветраніца***. Яны спяшаюцца адцвісці, пакуль у лесе шмат святла і вільгаці. Калі распусціцца лісце, у лесе пад дрэвамі і кустамі становіцца цёмна. А лясныя травы, як і іншыя расліны, без святла жыць не могуць.

Набухаюць і лопаюцца пупышкі на дрэвах і кустах. На іх з'яўляюцца лісце і кветкі. Распускаюцца жоўтыя **пухоўкі** на ***вербах*** (каткі). Зацвітаюць ***алешына, асіна***. У цёплай і вільготнай глебе прарастае насенне. Паўсюль зелянее трава.

Яшчэ снег на палях не паўсюль растаў, а ўжо зацвітае ***падбел***. Кветкі жоўтыя, круглыя, падобныя на сонейка. У падбела яшчэ лісце не распусцілася, а ён квітнее, спяшаецца ўпрыгожыць голую зямлю.

Сярод травяністых раслін шмат прыгожых, цікавых. На ўзбочынах дарог весела жаўцеюць ***дзьмухаўцы***. Гэтыя простыя кветкі ўсім



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

падабаюцца. Адцвітае дзьмухавец — разлятаецца ў розныя бакі саспелыя насенне. У лесе расцвітаюць маленькія белыя званочкі. Гэта кветкі ***ландыша***.

Неўзабаве ўсе дрэвы і кусты пакрываюцца маладымі клейкімі лісточкамі. Цвітуць ***клён, таполя, бяроза, чаромха, бэз***. У садах зацвітаюць ***слівы, вішні, яблыні, грушы, парэчкі***. На кветніках цвітуць ***цюльпаны, нарцысы***. У лесе цвітуць ***суніцы, чарніцы***.

Вясной кожны дзень зямлю прабіваюць, як вострым калком, новыя парасткі.

Многія расліны становяцца рэдкімі, таму што людзі зрываюць іх у прыродзе для букетаў. Па віне чалавека гінуць не толькі кветкі. Нямала бяроз гіне вясной. Дзеля саладкаватага бярозавага соку людзі раняць дрэвы. Бярозы хварэюць і гінуць.

1. Якія змены адбываюцца ў жыцці раслін вясной?

2. З чым звязаны змены ў жыцці раслін вясной?

3. Якія раннецвітучыя расліны вы бачылі ў прыродзе? Ці ўвесь снег растаў на час іх цвіцення?

4. Адгадайце загадку. Растлумачце, як здагадаліся.

Я шариком пушистым белею в поле чистом.
А дунул ветерок — остался стебелёк.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Адтава́ць, першацве́т, пухо́ўка, па́растак.**

Пастаўце ў ваду галінку дрэва або куста. Назірайце за галінкай і той раслінай, з якой вы яе зрэзалі. Абмяркуйце, што назіраеце.

Прыміце ўдзел у вясновай працы на агародзе, у садзе. Паназірайце за цвіценнем бэзу (па магчымасці). Адзначце дзень, калі завялі ў яго апошнія кветкі. Гэты час лічыцца канцом вясны і пачаткам лета.

Вясной урокі часам праводзяцца на агародзе, у садзе. Дзеці вучацца сеяць насенне, рабіць разоры, высаджваць расаду на градкі, паліваць яе. Без кніжак, без алоўкаў і сшыткаў выдатна праходзяць урокі. А як у вас?

## 34. Жывёлы вясной

Раскажыце, што змянілася ў жыцці жывёл з надыходам вясны. Ці з'явіліся насякомыя? Якія пералётныя птушкі вярнуліся ў вашу мясцовасць? Чым яны заняты? Пры адказе карыстайцеся сваімі назіраннямі ў прыродзе.

Як толькі прыгрэе вясновае сонца, прачынаюцца насякомыя. З кожным днём іх з'яўляецца ўсё больш. Насякомым ёсць чым паласавацца. Над



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

кветкамі пырхаюць ***матылі***. Аблятаюць кветкі ***пчолы***. Выпаўзаюць ***мухі, божыя кароўкі***. Вакол мурашнікаў мітусяцца ***мурашкі***.

З выраю прылятаюць ***пералётныя птушкі***. Большасць з іх уюць гнёзды. Тут яны выседжваюць яйкі і выкормліваюць птушанят.

Прачынаюцца ***жабы, яшчаркі, рапухі, змеі***. Яны выпаўзаюць на сонечныя месцы, каб адагрэцца. У вадаёмах прачынаюцца ***рыбы***.

У многіх звяроў вясной з’яўляюцца дзіцяняты. Першы час звяры кормяць іх сваім малаком. Яны абараняюць слабых, бездапаможных звяркоў, саграваюць сваім цяплом. Потым прывучаюць дзіцянят самастойна здабываць сабе корм.

Чым больш корму, тым лягчэй жывёлам пракарміцца. Але для дзікіх жывёл пачатак вясны — цяжкі час. Скончыліся ўсе зімовыя запасы. **Змарнелі** звяры і птушкі — няма тлушчу пад скурай. Ад доўгага жыцця **надгаладзь** яны аслабелі. А тут яшчэ завірухі і завеі нярэдка налягалі. Як дажыць да цёплых дзён? На дапамогу дзікім жывёлам прыходзяць людзі. Яны і вясной падкормліваюць дзікіх жывёл.

Усе звяры вясной **ліняюць**. Іх цёплая шэрсць замяняецца больш рэдкай.

Свойскіх жывёл вясной выганяюць на пашы. Разам з дарослымі жывёламі пасвіцца выходзіць



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**маладняк.** Людзі працягваюць даглядаць свойскіх жывёл.

1. Якія змены адбываюцца ў жыцці дзікіх жывёл вясной?

2. Чаму пералётныя птушкі вяртаюцца да нас вясной?

3. Як дзікія жывёлы клапоцяцца пра сваё патомства?

4. Як змяняецца жыццё свойскіх жывёл вясной?

**Змарне́ць, на́дгаладзь, ліня́ць, маладня́к.**

Абмяркуйце, чаму вясной вавёрка зноў робіцца рыжай, а заяц — шэрым.

Разам з дарослымі зрабіце шпакоўню. Павесьце яе на дрэве на вышыні не менш за два метры. Размясціце домік так, каб адтуліна не была акружана галінкамі. Бо гняздо ў шпакоўні не павінна быць даступнае для катоў. Хай шпакі радуюць вас сваімі песнямі.

Вясной дзеці пайшлі на луг. У ямках яны ўбачылі маленькіх рыб — малькоў. Сонца прыгравала. Ямкі перасыхалі. Малькам пагражала гібель.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Дзеці пабеглі дадому. Яны надзелі боты, узялі вядзерцы і вярнуліся на луг. Закіпела праца. Дзеці вычэрпвалі ваду з ямак разам з малькамі. Яны адносілі рыбак да вадаёма і выпускалі іх у ваду.

## Паўторым галоўнае пра вясну

Вясновыя месяцы — сакавік, красавік, май. Вясной сонца падымаецца ўсё вышэй. Сонечныя промні ўсё больш грэюць зямлю. Дні становяцца больш доўгімі, а ночы — больш кароткімі.

Ад вясновага цяпла растае снег. Бягуць ручаі. Адаграваецца глеба, з'яўляюцца праталіны. Растае і ламаецца лёд на рэках і азёрах. Выходзіць на яго вясной небяспечна.

З'яўляецца зялёная трава. Распускаецца лісце на дрэвах і кустах. Расцвітаюць першыя вясновыя кветкі.

Вясной прачынаюцца насякомыя. Вяртаюцца з выраю пералётныя птушкі. Яны будуюць гнёзды. У звяроў з'яўляюцца дзіцяняты. Свойскія жывёлы выходзяць на пашы.

Пачынаецца вясновая праца. У агародах, на палях людзі сеюць насенне раслін, высаджваюць расаду. У садах садзяць дрэвы, кусты.

Вясной трэба быць уважлівым да свайго здароўя. Вопратку і абутак варта падбіраць з улікам



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

надвор'я. Нельга знаходзіцца ў мокрым адзенні і абутку.

### Праверым сябе

1. Прачытайце тэкст. Якая пара года апісана ў ім?

Снег растае. Ручаі звіняць. Птушкі вяртаюцца з выраю.

2. Растлумачце значэнне прыказкі.

Араць, ды не драмаць.

3. Адгадайце, пра якую прыкмету вясны ідзе гаворка ў загадцы. Растлумачце, як здагадаліся.

Што ўніз вярхушкай расце?

4. Разгледзьце малюнак на першым форзацы. Так мастак намаляваў працягласць вясновага дня і вясновай ночы. Што ён хацеў паказаць сваім малюнкам?

5. Прачытайце апісанне сезонных зменаў у прыродзе. Якія з іх адносяцца да вясновых?

Сонца дабра грэе зямлю. Сонечныя промні мала грэюць зямлю.

Дзень короткі. Ноч доўгая. Дзень доўгі. Ноч кароткая.

Холадна. Цёпла. Горача. Марозна.

Халодная імжа. Галалёд. Цёплы дождж. Дождж з градам. Туман. Шэрань. Навальніца. Вясёлка. Снегапад.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Шмат корму для ўсіх жывёл. Мала корму для ўсіх жывёл. Няма корму для пералётных птушак.

Прырода квітнее. Прырода адпачывае. Прырода вяне.

**6.** Раскажыце пра вясновае надвор'е. Правільна выберыце словы з дужак.

Надвор'е вясной больш *(цёплае, халоднае)*, чым зімой. Вясной *(рэдка, часта)* ідзе *(дождж, снег)*. Сонечных дзён вясной *(больш, менш)*, чым зімой.

## 35. Нaперадзе лета. Ахова здароўя летам

Прачытайце і абмяркуйце сітуацыю. Пра якую пару года ідзе гаворка? Вы назіралі ў прыродзе падобныя з'явы?

Горача. Набегла цёмная хмара. Паліў дождж. Зазіхацела маланка. Загрымеў гром. Хмара знікла. На небе з'явілася вясёлка.

Па календары лета пачынаецца 1 чэрвеня. Яно працягваецца тры месяцы: ***чэрвень, ліпень, жнівень*** (малюнак на другім форзацы). Сонца высока падымаецца ў небе. Летам дні доўгія, а ночы кароткія. Зямля атрымлівае шмат сонечнага святла і цяпла. Летам бываюць навальніцы. Пасля іх на небе з'яўляецца вясёлка.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Лісце на дрэвах і кустах летам ярка-зялёнае. Шмат кветак. Спеюць ягады, садавіна, гароднiна.

Летам шмат насякомых. Птушкі выкормліваюць птушанят, вучаць іх лятаць. Для звяроў летам дастаткова корму. Звяры вучаць сваіх дзіцянят самастойна здабываць сабе корм. Свойскія жывёлы з раніцы да позняга вечара знаходзяцца на пашах.

Летам у людзей шмат працы. Трэба даглядаць расліны на палях, у агародах, садах. На зіму людзі нарыхтоўваюць гародніну, садавіну, ягады. Робяць запасы корму для свойскіх жывёл.

У школьнікаў летам канікулы. Усе тры летнія месяцы можна адпачываць, дабіраць сіл. Разам з дарослымі дзеці купаюцца, загараюць, збіраюць у лесе ягады. Сонца, паветра і вада загартоўваюць чалавека.

Летам трэба больш адпачываць на прыродзе (у лесе, ля вадаёмаў і інш.). Купацца і плаваць можна толькі **пад наглядам** дарослых. Нельга купацца ў вельмі халоднай вадзе. Летам нельга хадзіць з непакрытай галавой пад гарачымі промнямі сонца.

Сонца — велізарны палымяны шар. Глядзець непасрэдна на яркае сонца шкодна. Можна сапсаваць



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

зрок. У сонечныя дні людзі надзяваюць **сонцаахоўныя** акуляры.

Збіраючы лясныя ягады, трэба глядзець, ці **спелыя** яны. У спелых ягадах шмат вітамінаў і іншых карысных рэчываў. Лясныя ягады карысней за ўсё есці ў свежым выглядзе.

1. Чаму летам цяплей, чым вясной?
2. Што змянілася ў жыцці раслін летам?
3. Як змянілася жыццё дзікіх жывёл летам?
4. Чым займаюцца людзі летам?
5. Адгадайце загадку. Растлумачце, як здагадаліся.

Вялікі сланечнік у небе, цвецiць ён шмат гадоў.
Цвіце зімой і летам, а семак ўсё няма.

6. Раскажыце пра правілы аховы здароўя чалавека летам.

**Пад нагля́дам, сонцаахо́ўны, спе́лы.**

Разгледзьце малюнкі на другім форзацы. Якія прыкметы лета паказаны? Што з таго, што намалявана, вы ўжо назіралі ў прыродзе?

### Чатыры пары года

1. Мастак намаляваў год у выглядзе стужкі. Палічыце квадрацікі на ёй. Чаму іх дванаццаць?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Як яны размаляваны? Колькі квадрацікаў на стужцы займае восень? Зіма? Вясна? Лета? Якія колеры



абраны для кожнай пары года? Чаму?

2. Назавіце поры года, пачынаючы з восені. Якая пара года ідзе пасля зімы? Якая пара года бывае перад летам?

3. Назавіце месяцы кожнай пары года.

4. Якія з’явы прыроды характэрны для кожнай пары года?

Аднойчы ў спякотны дзень мама надзела на галаву дачкі хустку. «Не хадзі з непакрытай галавой. Можна атрымаць ***сонечны ўдар***», — сказала мама. «Сонца не можа біцца. Прыдумала ты, мама, нейкі ўдар», — запярэчыла дзяўчынка. На двары дзяўчынка зняла хустку. У абед галава ў яе разбалелася, закружылася. Ёй стала млосна...

Чаму дзяўчынцы стала млосна? Ці можна было пазбегнуць гэтага?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ЗМЕСТ

## Чалавек і яго здароўе

### Здароўе чалавека — яго галоўнае багацце

1. Чалавеку важна быць здаровым . . . . . . . . . . . 4
2. Значэнне рэжыму дня, заняткаў фізкультурай . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7

### Прафілактыка хвароб

3. Прафілактыка няшчасных выпадкаў дома, у школе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 10
4. Прафілактыка няшчасных выпадкаў на вуліцах (на дарогах). . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14
5. Прастудныя хваробы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 18
6. Грып — небяспечная хвароба . . . . . . . . . . . 20
7. Лячэнне прастудных хвароб . . . . . . . . . . . . . 21
8. Прафілактыка прастудных хвароб. . . . . . . . . 24

### Азбука харчавання

9. Правілы здаровага харчавання . . . . . . . . . . . 27
10. Прыкметы і прафілактыка харчовых атручэнняў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 30

## Чалавек і грамадства

### Мая сям'я

11. Сям'я і родзічы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 34



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

12. Клопат членаў сям'і адзін аб адным . . . . . . . 36
13. Абавязкі членаў сям'і . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40
14. Сумесны адпачынак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 44

## Праца людзей

15. Прафесіі работнікаў школы . . . . . . . . . . . . . . 49
16. Прадметы, створаныя чалавекам . . . . . . . . . . 53
17. Хто вырабляе прадукты харчавання . . . . . . . 58
18. Праца школьнікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 62

## Мой горад (мая вёска)

19. У горадзе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 67
20. У вёсцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 71
21. Установы горада і вёскі.
Магазіны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 73
22. Адпачынак у выхадны дзень . . . . . . . . . . . . . 76

## Мая краіна

23. Наша Радзіма — Рэспубліка Беларусь . . . . . 85
24. Дзяржаўныя сімвалы — сцяг,
герб, гімн Рэспублікі Беларусь . . . . . . . . . . . 89
25. Буйныя гарады Беларусі . . . . . . . . . . . . . . . . 92
26. Славутыя людзі беларускай зямлі . . . . . . . . . 95

## Прадметы вакол мяне

27. Разнастайнасць адзення . . . . . . . . . . . . . . . . 101
28. Разнастайнасць абутку . . . . . . . . . . . . . . . . . 105



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

29. Бытавыя прыборы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 110
30. Кожнай рэчы — сваё месца . . . . . . . . . . . . . . 113

## Прырода і чалавек

### Поры года (працяг)

31. Расліны і жывёлы зімой . . . . . . . . . . . . . . . . . . 119
32. Вясна. Ахова здароўя вясной . . . . . . . . . . . 126
33. Расліны вясной . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 129
34. Жывёлы вясной . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 132
35. Наперадзе лета. Ахова здароўя летам . . . . 137



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

(Назва і нумар установы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |


Вучэбнае выданне

**Шаўчэнка** Наталля Алегаўна
**Серадзінская** Вольга Харытонаўна

# ЧАЛАВЕК І СВЕТ

Вучэбны дапаможнік для 4 класа першага аддзялення дапаможнай школы з беларускай мовай навучання

У 2 частках

Частка 2

Рэдактары *Т. А. Іванова, М. М. Шавыркіна*
Мастак вокладкі *К. К. Шастоўскі*
Мастацкі рэдактар *Д. В. Варакса*
Мастакі *А. У. Баулаў, К. У. Максімава, Д. М. Матарыкін, А. Ю. Прынькова, К. К. Шастоўскі*
Камп’ютарны набор *М. М. Шавыркінай*
Камп’ютарная вёрстка *А. І. Стахавец*
Карэктары *Т. А. Іванова, М. М. Шавыркіна*

Падпісана да друку 11.08.2016. Фармат 70 × 90 $^1/_{16}$. Папера афсетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 10,53 + 0,29 форзац. Ул.-выд. арк. 4,6 + 0,4 форзац.
Тыраж 497 экз. Заказ

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/19 от 14.11.2014.
Вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «БудМедыяПраект».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/42 от 13.02.2014.
Вул. В. Харужай, 13/61, 220123, г. Мінск.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне



20 сакавіка
дзень роўны ночы

# ПРЫКМЕТЫ ВЯСНЫ
## (сакавік – красавік – май)



Сонца прыгравае

Растае снег

Крыгаход





З'яўляюцца першацветы





Набухаюць пупышкі



Распускаецца лісце



Прачынаюцца насякомыя







Птушкі будуюць гнёзды



У многіх звяроў з'яўляюцца дзіцяняты



Што надзець?



Вясновая праца



Праца ў полі





20–21 чэрвеня — самы доўгі дзень

# ПРЫКМЕТЫ ЛЕТА
## (чэрвень – ліпень – жнівень)



Цёпла,
бывае горача



Цвітуць расліны



Спее ўраджай



Многа насякомых



Падрастаюць птушаняты



Звяры вучаць дзіцянят



Што надзець?



Даглядаюць расліны



Робяць нарыхтоўкі на зіму

